

## Парады па ваджэнні ў галалёдзіцу

СТАР. 3



## Як працавалі нашы медыкі ў Ліване

СТАР. 4



## Што думалі продкі, гледзячы на неба

СТАР. 10

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў сярэдняга і вышэйшага звяна, рабочых кадраў для прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі ў рэгіёне мае патрэбу ва ўдасканаленні. Асноўная праблема заключаецца не ў размеркаванні кадраў, а ў тым, што маладыя спецыялісты, якія сёння прыходзяць на прадпрыемствы, не адпавядаюць пажаданаму ўзроўню наймальнікаў, яны не гатовыя да самастойнай працы. Іх неабходна перавучваць, вучыць. Таму наша галоўная задача — у тым, каб сфарміраваць трывалае ўзаемадзеянне ўстаноў прафтэхадукацыі, ССНУ з прадпрыемствамі прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Магчыма, будзе прынята рашэнне аб стварэнні кластараў, у якіх шэраг прадпрыемстваў стануць працаваць у звязку з пэўнымі навучальнымі ўстановамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9787 | ▼ |
| Еўра | 2,4312 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0349 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0685 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

20 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 14 (28630)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# Набыткі «зялёнага» банка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Папаўненне і агляд стану гербарнай калекцыі навуковага аддзела Бярэзінскага біясфернага запаведніка — турбота і неабходная праца навукоўцаў-батанікаў. Вядучы навуковы супрацоўнік, кандыдат сельскагаспадарчых навук Яўгенія ІЎКОВІЧ *(на фота злева)* амаль сорак гадоў не толькі даследуе флору найстарэйшага ў краіне запаведніка, але і сама адкрывае новыя віды раслін. У гэтым ёй ужо дваццаць пяць гадоў дапамагае старшы навуковы супрацоўнік Святлана АЎТУШКА.

■ На свае вочы

## «Дакрануцца» да калайдара

### і зазірнуць на фабрыку антыматэрыі змаглі звычайныя педагогі




Памяшканне, дзе размяшчаўся першы вэб-сэрвіс у свеце.

**Вакол Вялікага адроннага калайдара існуе мноства міфаў. Ёсць, напрыклад, думка, што эксперыменты і спробы вучоных разгадаць асновы стварэння Сусвету могуць прывесці чалавецтва да глабальнай катастрофы. Найбольш часта абмяркоўваецца небяспека ўзнікнення мікраскапічных чорных дзірак з наступнай ланцуговай рэакцыяй захопу навакольнай матэрыі. Да таго ж калайдар па тэхнічных прычынах пастаянна спыняецца. Пагадзіцеся, што далёкаму ад фізікі высокіх энергій чалавеку складана паверыць у тое, што найбуйнейшы паскаральнік ядзерных часціц можа вывесці са строю... звычайны тхор. Тым не менш у 2016 годзе менавіта гэтага звярка абвінавацілі ў кароткім замыканні, якое спыніла работу самай дарагой устаноўкі ў свеце.**

**Што насамрэч адбываецца на мяжы Швейцарыі і Францыі, дзе на глыбіні каля ста метраў размяшчаецца Вялікі адронны калайдар, удалося пабачыць на свае вочы групе педагогаў, якія сталі ўдзельнікамі Навуковай школы для настаўнікаў фізікі ў CERN (European Organization for Nuclear Research, Geneva). Сярод шчаслівых аказалася і настаўніца фізікі з жодзінскай гімназіі № 1 Эла ЯКУБОЎСКАЯ.**

СТАР. 11

■ Рэпарцёр

## КІРАЎНІК ВЕСЯЛОСЦІ АБО ДЗЯЖУРНЫ ПА АТРАКЦЫЁНАХ

### Як мы наведалі курсы перападрыхтоўкі для беспрацоўных

**Не так даўно навукоўцы выявілі, што стрэс ад страты або змены месца працы ўваходзіць у топ-3 самых моцных негатыўных перажыванняў сучасных людзей. І сапраўды, канкурэнцыя з кожным годам павялічваецца — усё ж нас ужо больш за сем мільярдаў! Прычым цяпер прыходзіцца «змагацца» не толькі за кіруючыя пасады, але і за месцы па рабочых спецыяльнасцях. Каб угнацца за светам, які так хутка мяняецца, часам даводзіцца садзіцца за парту і пасля 50...**

#### Жыццё з чыстага ліста з новай спецыяльнасцю

Але не будзем забягаць наперад. Шчыра кажучы, сітуацыя са стратай работы непрыемная, але не крытычная — створаны ўсе ўмовы, каб надоўга не затрымлівацца ў не надта камфортным статусе беспрацоўнага. Прыдатныя прапановы можна шукаць самастойна, праз агульнагарадскую базу, абавязковыя да наведвання і кірмашы вакансій, якія праводзяцца з зайздроснай рэгулярнасцю. І галоўнае — трэба быць гнуткім: адны прафесіі знікаюць — прывітанне ў мінулае камінарам, машыністкам і адміністратарам камп'ютарных клубаў, а іншыя, наадварот, толькі зараджаюцца, самы час успомніць спецыялістаў па крыптавалюце, ці пачынаюць патрабаваць больш вузкіх ведаў. Для таго каб задаволіць запыты горада ў пэўных кадрах, даць магчымасць знайсці сабе новую спецыяльнасць прадстаўнікам незапатрабаваных прафесій або тым, хто па розных абставінах не можа больш спраўляцца са сваімі мінулымі абавязкамі, і існуюць курсы прафесійнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі беспрацоўных.

СТАР. 5

■ Грамадзянская супольнасць

# «БЕЛАЯ РУСЬ» ПАКУЛЬ НЕ СТАЛА ПАРТЫЯЙ

## А старшынёй арганізацыі абралі Генадзя Давыдзьку

**Такое рашэнне аднагалосна прыняў учора Рэспубліканскі савет «Белай Русі» на III з'ездзе грамадскага аб'яднання ў Мінску. Кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька адзначыў, што расцэньвае сваё абранне як вялікі аванс.**



Фота БЕЛТА.

Дарэчы, цяпер ужо экс-старшыня «Белай Русі» Аляксандр РАДЗЬКОЎ застаўся ў складзе Рэспубліканскага савета арганізацыі. У сваім выступленні на з'ездзе ён адзначыў, што патэнцыял «Белай Русі» як грамадскага аб'яднання яшчэ не вычарпаны.

«За дзесяць гадоў свайго існавання аб'яднанне стала аўтарытэтнай грамадска-палітычнай арганізацыяй і магло б выступаць як самастойны суб'ект палітычных адносін, напрыклад, пераўтварыцца ў партыю, — сказаў Аляксандр Радзькоў. — Аднак прадметна вывучаючы тэндэнцыі, якія адбываюцца ў сучасным хутка зменлівым свеце, можна заўважыць відавочнае ўзмацненне раз'яднанасці сусветнай супольнасці. Гэта кідае выклік прыхільнікам традыцыйных палітычных партый, прыхільнікам левых і правых ідэалогій. Праведзены ў ходзе справаздачна-выбарчай кампаніі аналіз пацвердзіў, што з улікам сучасных сусветных тэндэнцый у існуючай палітычнай сістэме патэнцыял «Белай Русі» як грамадскага аб'яднання яшчэ не вычарпаны».

Напярэдадні з'езда Генадзь Давыдзька таксама выказаўся пра перспектывы змены статусу аб'яднання. «Мэта любой партыі — гэта барацьба за ўладу. «Белая Русь» за ўладу не змагаецца, яна змагаецца за росквіт нашага грамадства, — адзначыў ён. — «Белая Русь» — гэта армія патрыётаў, якая працуе на кансалідацыю і развіццё грамадзянскай супольнасці».

Аднак змены ў рабоце грамадскага аб'яднання ў найбліжэйшы час адбудуцца. Паводле слоў Аляксандра Радзькова, «Белая Русь» перанясе асноўныя акцэнты сваёй дзейнасці на ідэалагічнае суправаджэнне дзяржаўных рашэнняў, а таксама экспертную і аналітычную працу. Плануецца, што арганізацыя дасць грамадзянам магчымасць удзельнічаць у экспертызе законапраектаў, абмяркоўваць іх на этапе распрацоўкі. Такім чынам, упэўнены экс-старшыня аб'яднання, гэта будзе спрыяць развіццю грамадскай правасвядомасці, павышэнню даверу грамадзян, дапаможа папярэджваць і вырашаць сацыяльныя канфлікты.

Ён таксама адзначыў, што прафесійны вопыт аб'яднання можа быць накіраваны і на знешні контур, карысны пры вызначэнні аспектаў эканамічнага і сацыяльна палітычнага развіцця. Акрамя таго, кадравы тэхнічны і тэхналагічны патэнцыял дазваляе гаварыць пра тое, што «Белая Русь» сёння — актыўны ўдзельнік у палітычнай, эканамічнай, сацыяльна-духоўнай сферах жыцця нашага грамадства.

Аляксандр Радзькоў таксама адзначыў, што «Белая Русь» хоча ўзяць пад патранаж бізнес малога і сярэдняга ўзроўню. «Гэта работа дасць магчымасць стварыць дадатковыя ўмовы для развіцця народнага прадпрымальніцтва, заняць прадпрымальную моладзь і захаваць жывы актыў у краіне», — дадаў ён.

На III з'ездзе аб'яднання падвялі вынікі работы за 2012—2017 гады, абмеркавалі прыярытэтныя кірункі на перспектыву, а таксама зацвердзілі новыя рэдакцыі статута і праграмы. Акрамя гэтага, абраны рэспубліканскі савет і цэнтральная кантрольна-рэвізійная камісія грамадскага аб'яднання.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

### ❍ Каментарый у тэму

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА:**

— Калі будзе пасыл, неабходнасць у гэтым (у пераўтварэнні ў партыю. — **Аўт.**), і яна наспее, тады і магчыма будзе стварэнне партыі. Пакуль такога мы не ўбачылі і не пачулі. Значыць, пакуль не час. У краіне грамадскае аб'яднанне сябе зарэкамендавала.

Таксама Наталля Качанава адзначыла, што за мінулую пяцігодку арганізацыя прырасла колькасна, пасняхова вырашала пастаўленыя перад ёй задачы. Што датычыцца перспектыў, то Наталля Качанава падкрэсліла, што «Белая Русь» — гэта добры кадравы рэзерв для вертыкалі ўлады.

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна ШЧОТКІНА:**

— Пытанне пераўтварэння ў партыю вельмі складанае. Калісьці ў «Белай Русі» было анкетаванне — і большасць выступіла за грамадскае аб'яднанне. Усё ж такі партыя — гэта палітыка, партыйная дысцыпліна, партыйныя мэты, якія ўсе абавязаны выконваць. Таму, на мой погляд, грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», вядома, ужо паспела для таго, каб стаць партыяй, але для гэтага патрэбна воля знутры, гэта значыць, само грамадскае аб'яднанне павінна пра гэта заявіць: мы хочам і мы гатовыя.

## Адораным — падтрымка

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Згодна з рашэннем, амаль 277 тысяч рублёў будуць накіраваныя на выплату 179 стыпендый студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі, 29 грашовых прэмій пераможцам міжнародных алімпіяд па вучэбных прадметах, конкурсаў творчых дасягненняў і навукова-тэхнічнай творчасці, 185 заахвочвальных прэмій педагагічным і навуковым работнікам, якія ўнеслі ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі.

Таксама каля 65 тысяч рублёў накіруюць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і метадычнай базы студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Структура і дынаміка біялагічнай разнастайнасці» БДУ ў мэтах павышэння якасці практычнай падрыхтоўкі студэнтаў біялагічных спецыяльнасцяў.

■ Супрацоўніцтва

# ПЕРШЫЯ ЭЛЕКТРОБУСЫ

**Гэтыя дзве кітайскія машыны адразу атрымалі імёны па назвах гарадоў, якія пасябравалі, — «Чанша» і «Магілёў». Учора яны правезлі першых пасажыраў па цэнтральнай вуліцы Магілёва Першамайскай — ад плошчы Славы да чыгуначнага вакзала.**

Элегантныя на выгляд машыны, створаныя ў Кітаі з прымяненнем вядучых тэхналогій, былі перададзены ў дар Магілёву ў гонар яго 750-годдзя. Цяпер яны будуць курсіраваць на тралейбусным маршруце № 4 паміж чыгуначным вакзалам і пасёлкам Любуж. Спецыялісты адзначаюць, што разавай зарадкі электробуса хапае на 200 кіламетраў руху. Агульная ўмяшчальнасць аўтобуса — 83 месцы. Рухаецца ён вельмі плаўна і амаль бясшумна. У салоне ёсць відэакамеры з вывадам карцінкі на экран у кабіне кіроўцы.



— Я быў вельмі рады наведаць Магілёў і паўдзельнічаць у запуску нашай тэхнікі, — паведаміў на ўрачыстай цырымоніі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін. — Зараз адносіны паміж Кітаем і Беларуссю — у лепшым развіцці. Прэзідэнты нашых краін надаюць гэтаму вялікую ўвагу. Вельмі важна супрацоўнічаць рэгіёнамі. Правінцыя Хунань і Магілёўская вобласць змаглі наладзіць паміж сабой цеснае супрацоўніцтва.

Мэр Магілёва Уладзімір Цумараў адзначыў, што заўсёды прыемна атрымліваць такія падарункі.

— Сяброўства з кітайскім горадам Чанша пачалося летась, — адзначыў ён. — Летам у рамках святкавання 750-годдзя Магілёва быў падпісаны дагавор аб устанаўленні партнёрскіх узаемавыгадных адносінаў. Мы прыкладзём максімум намаганняў, каб усе прапісаныя там пункты былі рэалізаваныя.

Акрамя электробусаў Магілёў атрымаў ад кітайскага боку яшчэ восем індывідуальных домікаў. Да Дня горада плануецца пабудаваць неабходныя інжынерныя сеткі і сабраць гэтыя дамы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### БОРЫС ДЖОНСАН ПРАПАНАВАЎ ПАБУДАВАЦЬ МОСТ ПАМІЖ БРЫТАНІЯЙ І ФРАНЦЫЯЙ

**Міністр замежных спраў Вялікабрытаніі прапанаваў прэзідэнту Францыі пабудаваць новую транспартную магістраль над Ла-Маншам.**



На перагаворах з Эмануэлем Макронам у Беркшыры Борыс Джонсан узняў пытанне аб будаўніцтве моста, заявіўшы, што добрыя транспартныя сувязі жыццёва важныя для будучых адносін дзвюх краін. Дзеючы тунэль можна лічыць усяго толькі першым этапам у наладжванні транспартных зносін, сказаў міністр. Зараз Брытанія і Францыя злучаныя толькі чыгуначным тунэлем, пракапаным пад Англійскім пралівам (брытанская назва Ла-Манша). Дарэчы, саміт Макрона і брытанскага прэм'ера Тэрэзы Мэй быў першым візітам выбранага ў мінулым годзе прэзідэнта Францыі ў Вялікабрытанію.

### РЫНАК КРЫПТАВАЛЮТ АДНАЎЛЯЕЦЦА

**Рынак лічбавых валют працягнуў аднаўленне пасля рэзкага падзення, пры гэтым самая папулярная ў свеце крыптавалюта біткойн гандлявалася каля адзнакі ў 11 тысяч долараў, сведчаць даныя таргоў.**

Пасля падзення ніжэй за адзнаку ў 10 тысяч долараў у чацвер ён перайшоў да росту, перавышаючы пазней адзнаку ў $12 тыс. На думку кіраўніка даследчага аддзела Blockchain Capital Спенсера Богарта, біткойн паказаў сваю здольнасць перажываць узрушэнні, тады як менш буйныя крыптавалюты ў гэтыя дні былі пераацэнены. Для многіх людзей сёння, лічыць эксперт, такая ўстойлівасць — выдатная магчымасць для пакупкі.

### У БЕЛЬГІІ МІГРАНТЫ НАПАЛІ НА ПАЛІЦЭЙСКІ ПАТРУЛЬ

**Каля 40 нелегальных мігрантаў з Афрыкі, якія рухаліся транзітам у Вялікабрытанію, напала на паліцэйскі патруль на адным з прыдарожных паркінгаў у раёне прыгарада Бруселя Гран Бігар, паведаміў прадстаўнік федэральнай паліцыі Пітэр Дэ Веле.**



Паводле яго слоў, паліцэйскія прыбылі на аўтастаянку пасля паступлення званкоў аб тым, што група мігрантаў-нелегалаў спрабуе залезці ў кузаў дальнабойнага транспарту, які накіроўваецца ў Вялікабрытанію. Каб уціхамірыць мігрантаў, у сутычцы з якімі лёгкія траўмы атрымалі двое патрульных, вартавыя парадку былі вымушаны адкрыць агонь у паветра. Пасля прыбыцця падмацавання паліцэйскі былі затрыманыя 16 выхадцаў з Эрытрэі, Эфіопіі і Судана, паведамілі ў паліцыі.

### ГЛЕДАЧЫ НАЗВАЛІ 100 ЛЕПШЫХ ФІЛЬМАЎ УСІХ ЧАСОЎ

**Паводле апытання, якое было праведзена журналістамі выдання Indie Wire, першае месца заняла музычная карціна «Чараўнік краіны Оз» (1939 год) рэжысёра Віктара Флемінга.**

На рахунку гэтай легендарнай кінастужкі — два «Оскары». Акрамя таго, у 1998 годзе яна трапіла ў дзясятку лепшых амерыканскіх фільмаў. Другі радок заняў «Грамадзянін Кейн» (1941 год) рэжысёра Орсана Уэлса. Гэтая амерыканская драма па працягу некалькіх дзесяцігоддзяў рэгулярна перамагала ў маштабных апытаннях кінапрафесіяналаў як «лепшы фільм усіх часоў і народаў». На трэцім месцы размясціўся фільм жахаў «Прэч» (2017) Джордана Піла. У карціне расказваецца пра знаёмства чарнаскурага фатографа з бацькамі яго белай дзяўчыны.

Утерянные страховые Полисы ЗАСО **«ПРОМТРАНСИНВЕСТ»** по ОСГО владельцев транспортных средств на территории РБ Серии ВВ №№ 3038497 и 0551966 – **считать недействительными**

В связи с поступившим заявлением об объявлении Домутя Алексея Анатольевича, 27.06.1979 года рождения, уроженца города Минска, зарегистрированного по адресу: город Минск, улица Кольцова, дом 26, квартира 83 (последнее известное место пребывания), умершим суд Заводского района г. Минска обращается с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим сведениями о Домуте Алексее Анатольевиче, сообщить их в суд Заводского района г. Минска (г. Минск, проспект Партизанский, 75а-17) в течение двух месяцев с момента публикации.

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

– квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№ 0198971, 0195210, 2259358, 0199096, 0551004, 0556755, 0206389, 0562000, 0554843, 2268101;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1200827, 1286012, 1481610, 1492096, 1492097, 1199109, 1613759-1613761, 1646735, 1660578, 1674565, 1674577, 1674578, 1109201, 1161897, 1187418, 1187419, 1623436, 1623439, 1610640, 1650737, 1688379, 1628430, 1628431;

– полис «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН, 2РП серии БИ № 0005075;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН, 2РП серии НС №№ 0022191, 0022193, 0034285.

– полис «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско)» формы 2РН, 2РП серии АК № 0067138;

– полис комбинированный «Добровольное страхование строений и домашнего имущества граждан; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН серии БИ № 0002504.

УНП 100782388

Коллективы Минского городского территориального фонда государственного имущества и коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» выражают всем родным и близким сотрудников фонда «Гомельоблимущество» Лычевко Любови Петровны и Михаленко Александра Викторовича, трагически погибшим в автомобильной катастрофе, искренние соболезнования.

Это непоправимая утрата не только для родных и близких, но и для коллег, работавших вместе с ними в фонде «Гомельоблимущество». В эти печальные дни скорбим и разделяем боль их утраты. Светлая память нашим коллегам.

■ Мост сяброўства

# ПАД УРАЖАННЕМ ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦІ І... СНЕГУ

## Ужо другі раз па запрашэнні кіраўніка дзяржавы ў Беларусь прыехалі дзеці з Сірыі

**Цяпер у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» адпачываюць не сіроты і тыя, хто пацярпеў падчас узброенага канфлікту, а таленавітыя і адораныя юныя сірыйцы.**



Фота БЕЛТА.

18 студзеня сірыйскія школьнікі наведалі Нацыянальную акадэмію навук Беларусі і азнаёміліся з апошнімі распрацоўкамі беларускіх вучоных.

Таму не дзіва, што, нягледзячы на ўзрост, пераможцам алімпіяд, дзецям з творчымі здольнасцямі і тым, хто мае высокія дасягненні ў спорце, асабліва цікава было пабываць у эпіцэнтры беларускай навукі. Вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук расказалі ім пра гістарычны шлях вядучай навуковай арганізацыі краіны, пазнаёмілі са сваімі апошнімі распрацоўкамі і дасягненнямі.

— Гэта, безумоўна, новы вопыт для дзяцей, мы ўражаны, што ў Беларусі на дзяржаўным узроўні надаецца вялікае значэнне навуцы, — перакананы **дырэктар Нацыянальнага цэнтра для адораных дзяцей у Сірыі Іскандэр МАНІФ**. — Падлеткі якраз плануюць сваю будучыню, і многія з іх хочуць працягнуць адукацыю за мяжой, у тым ліку ў Беларусі. Учора мы наведалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе нам прэзентавалі ўсе факультэты і спецыяльнасці. У вачах многіх я разгледзеў цікавасць і жаданне тут вучыцца, і мы ўдзячны, што такая магчымасць ёсць. Увогуле Беларусь вельмі адкрыта для сірыйцаў.

Як пацвердзіў **старшыня Савета маладых вучоных аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Станіслаў ЮРЭЦКІ**, у гэтых дзяцей высокія шанцы паступіць у ВНУ нашай краіны. «У дзяржаве створана цэлая сістэма навуковай падрыхтоўкі не толькі для беларускіх, але і замежных студэнтаў, — гаворыць навуковец. — Калі ж яны вырашаць абараніць у нас або кандыдацкую, або доктарскую дысертацыю, гэта будзе вялікі ўклад і ў беларускую, і ў сусветную навуку. Увогуле мы адкрыты да міжнароднага супрацоўніцтва з усімі краінамі. У гэты складаны для Сірыі час працягваем руку дапамогі дзецям, якія потым будуць аднаўляць сваю краіну, падымаць яе з папялішча».

Паездка ў Беларусь Амару Фаяду з Латакіі запомніцца на ўсё жыццё. Па-першае, таму, што ён упершыню за мяжой. Па-другое, ён ніколі дагэтуль не бачыў снегу. Белае покрыва, якое гэтымі днямі ахутала нашу краіну, дарэчы, здзівіла ўсіх сірыйцаў. А яшчэ многія з дзяцей адзначаюць нашу адкрытасць і добразычлівасць. Хазема Афіфа ўразілі велічныя будынкі, прыгожыя вуліцы і імклівы рух на іх. А Махамед Бакар прызнаўся, што ў Сірыі не ўбачыш як падобнай архітэктуры, так і такога высокага ўзроўню медыцыны і развіцця нанатэхналогій.

На працягу двух тыдняў, якія яны правядуць у нашай краіне, дзяцей з Сірыі плануюць як мага бліжэй пазнаёміць з беларускай культурай. У найбліжэйшы час дэлегацыя з Блізкага Усходу наведае Мірскі і Нясвіжскі замкі, Нацыянальны парк «Нарачанскі». Маленькія турысты ўжо пабывалі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета. Не забыліся арганізатары і пра тое, што ў першую чаргу гэта дзеці, таму запрасілі іх у аквапарк. У сваю чаргу, у «Зубраняці» сірыйцы пазнаёмяць беларускіх таварышаў, з якімі, дарэчы, вельмі хутка знайшлі агульную мову, з традыцыямі і нацыянальнымі адметнасцямі свайго народа.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Падпіска — 2018

# КАЛЯДЫ СКОНЧЫЛІСЯ, ЧАС ПАДАРУНКАЎ — НЕ!

## Добрая навіна: днямі ў сценах рэдакцыі адбыўся чарговы розыгрыш прызоў

**Лёс іх, як заўжды, вырашалі госці — педагог-арганізатар сталічнага Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт» Таццяна Віктараўна КАМЧЫЦ і інструктар РУП «Белсаюздрук» Зоя Іванаўна САНКОВІЧ *(на здымку)*.**



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Яны ж, падпісчыцы «Звязды», мелі магчымасць пераканацца, што ўсе дасланыя ў рэдакцыю карткі зарэгістраваны, размеркаваны па абласцях і асобна па горадзе Мінску. А галоўнае, што ўсе яны, так бы мовіць, прайшлі праз чароўны звяздоўскі капялюш, з якога па чарзе трэба было выцягнуць шчаслівыя.

Па традыцыі гэту ганаровую місію рэдакцыя таксама давярае гасцям — падпісчыкам, дзелавым партнёрам.

Такім чынам, з лёгкай рукі Таццяны Віктараўны і Зоі Іванаўны

**мікрахвалевую печку Horizont выйгралі:**

**Пётр Сцяпанавіч КОЎШЫК, в. Галы Бор Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці;**

**Ала Мікалаеўна ПРАКАПНЁВА, г. Віцебск;**

**Наталля Генадзеўна КАВАЛЕНКА, в. Ламавічы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці;**

**Ірына Канстанцінаўна КУНЦЭВІЧ, в. Дубно Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці;**

**Зоя Іванаўна САМЕЦ, г. Клічаў Магілёўскай вобласці;**

**Фёдар Фёдаравіч ВАСІЛЕЎСКІ, в. Гушчына Уздзенскага раёна Мінскай вобласці;**

**Галіна Станіславаўна САРАГАВЕЦ, г. Мінск.**

**Суперпрыз — пліту газавую Gefest — выйграла Людміла Баляславаўна РОМАН з в. Камень Валожынскага раёна Мінскай вобласці.**

Віншуем шчаслівчыкаў! Тым жа, каго ўдача гэтым разам абмінула, скажам: вы не выйгралі? Але ж нічога і не прайгралі, бо да кожнага, хто падпісаўся, пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць (без перабольшвання, відаць) родная газета...

У пацвярджэнне — маленькі штрых: надоечы адна з падпісчыц «Звязды» паскардзілася, што не можа купіць галёшы... Другая, прачытаўшы пра гэта ў газеце, удакладніла адрас, каб выслаць першай патрэбны абутак.

Так што час падарункаў працягваецца, і далучыцца да іх атрымальнікаў альбо адпраўнікоў да чытачоў-падпісчыкаў «Звязды» сапраўды ніколі не позна.

**Афіцыйна**

*Арганізатарам рэкламнай гульні «Звяздоўскія» падарункі для вашых пачастункаў» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.*

*Рэкламная гульня «Звяздоўскія» падарункі для вашых пачастункаў» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 28.11.2017 г. (пасведчанне № 3164) і праводзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 снежня па 31 сакавіка 2017 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2017 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 302 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.*

*Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 337 44 04.*

■ Аўто

# НЕ ЎПЭЎНЕНЫ — НЕ СЯДАЙ!

## Галоўныя парады па ваджэнні ў галалёдзіцу і снегапад



**Мінулая серада стала для аўтааматараў сапраўдным кашмарам: за адзін дзень толькі ў сталіцы адбылося 196 дарожна-транспартных здарэнняў, а гэта амаль у два разы больш, чым у сярэднім за суткі ў гэтую пару года, тады як усяго па краіне зафіксавана больш за 500 ДТЗ. Складаныя ўмовы надвор'я — галалёд і снегапад — сталі прычынай аварый як для недасведчаных кіроўцаў, так і для спрактыкаваных. Напрыклад, у аварыю недалёка ад станцыі метро «Маскоўская» трапіў мужчына з 25-гадовым аўтастажам, таму ў такой сітуацыі досвед не заўсёды ратуе. Як паводзіць сябе ў падобных умовах за рулём і не стаць ахвярай надвор'я — на гэтыя пытанні адказаў старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Аляксандр БРУЙ.**

Дык якім чынам лепш кіраваць аўто на слізкай і заснежанай дарозе? «Калі адбываюцца рэзкія змены надвор'я, многія кіроўцы не могуць адаптавацца, таму што элементарна адвыкаюць ад заснежаных трас, — адзначае старшы інспектар. — Людзі прывыклі да чыстага асфальту і ўстойлівай язды, таму ў такой сітуацыі рэкамендуецца банальна знізіць хуткасць руху. Так, гэта варта зрабіць нават у тым выпадку, калі транспартны паток здольны рухацца з дазволенай хуткасцю. Дарога можа быць слізкай — а што, калі дарожныя службы не паспелі апрацаваць палатно адпаведнымі рэчывамі? Трэба быць максімальна сабраным і ўважлівым, захоўваць дыстанцыю, бо на такой дарозе тармазны шлях павялічваецца ў разы».

Таксама Аляксандр Бруй рэкамендуе цалкам чысціць аўтамабіль ад снегу перад паездкай, а асаблівую ўвагу ўдзяліць шклу. Нават калі вы спазняецеся на работу, лепш патраціць лішнюю хвіліну і прайсціся па ўсёй паверхні шклення, — на жаль, менавіта недастатковая бачнасць становіцца частай прычынай аварый. Акрамя таго, ДАІ рэкамендуе неспрактыкаваным кіроўцам па магчымасці адмовіцца ад кіравання аўто ў такія дні — гэта абыдзецца танней і спакайней.

Калі ваш аўтамабіль на дарозе ўсё ж занесла, магчымасць пазбегнуць ДТЗ існуе, упэўнены старшы інспектар. «Калі ў вас пярэдні прывад, то трэба круціць руль у бок заносу і паступова націскаць на педаль газу — тады машына будзе выраўноўвацца. Калі ў аўто задні прывад, то трэба плаўна тармазіць рухавіком і круціць руль у бок, процілеглы заносу. Што датычыцца машын з поўным прывадам, то ніколі не варта спадзявацца толькі на аўтамабіль, таму што гэта сітуацыя можа здарыцца з кожным», — дадае Аляксандр Бруй.

На жаль, нярэдка з'яўляюцца навіны пра тое, як аўтамабілі глухнуць на аддаленых трасах і не заводзяцца, на вуліцы — моцны мароз і снег, а дапамогі чакаць няма адкуль. Што рабіць у такой сітуацыі? На думку Аляксандра Бруя, падобныя здарэнні трэба папярэджваць загадзя і рабіць усё, каб аўтамабіль не заглух. «Перад любой далёкай паездкай трэба праверыць сваю машыну, каб быць упэўненым у яе спраўнасці, — падкрэслівае Аляксандр. — Калі ўжо такое адбылося, то трэба мець з сабой зараджаны мабільны тэлефон, каб у любы момант выклікаць падмогу — МНС ці міліцыю. Ніхто не пакіне званок без увагі, а супрацоўнікі абавязкова акажуць любую пасільную дапамогу». Ён таксама адзначыў, што па дапамогу прафесійных ведамстваў лепш звяртацца толькі ў сапраўды сур'ёзных сітуацыях, паколькі калі кожны стане выклікаць нарад, то супрацоўнікаў папросту на ўсіх не хопіць.

Што датычыцца тэхнічнай часткі, то кіроўцам варта праверыць стан акумулятара і сістэмы астуджэння, у якой, дарэчы, трэба выкарыстоўваць спецыяльныя вадкасці, а не ваду. Калі ў вас дызельны аўтамабіль, то рэкамендуецца запраўляць спецыяльнае паліва, разлічанае на мінусавыя тэмпературы. Можна таксама ўцяпліць рухавік, каб уздзеянне маразоў адчувалася не ў поўнай меры.

Кожны кіроўца, які зімой адпраўляецца ў далёкую паездку, павінен мець у машыне набор неабходных рэчаў — у першую чаргу буксіровачны трос. Акрамя таго, пажадана мець запас антыфрызу, каб быць гатовым да магчымых праблем у выпадку разгерметызацыі сістэм астуджэння. Кіроўцам варта сачыць за ўзроўнем шклоачышчальнай вадкасці, паколькі пры моцным снезе бачнасць можа стаць крытычнай — асабліва гэта датычыцца загарадных трас з высокім хуткасным абмежаваннем. У дарогу можна прыхапіць прыбор для награвання вады — напрыклад, кіпяцільнік, які працуе ад прыпальвальніка, а можна проста ўзяць тэрмас з гарачай гарбатай.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Узброеным Сілам 100 гадоў

# МІСІЯ — РАТАВАЦЬ ЖЫЦЦІ

**У Ліване ваенныя медыкі частавалі іншаземцаў стравамі з бульбы і вучылі іх размаўляць па-беларуску**



Беларускі медыцынскі кантынгент у Ліване.

**Веры Паўлянковіч і Вользе Яхнавец не прызвычайвацца аказваць медыцынскую дапамогу ў палявых і нават экстрэмальных умовах. Гэта з выгляду дзяўчаты далікатныя. Насамрэч у медыцынскім атрадзе спецыяльнага прызначэння 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл служаць толькі самыя стойкія, загартаваныя і смелыя, гатовыя ў любы момант прыйсці на дапамогу, а то і выратаваць жыццё.**

Не так даўно дзяўчаты вярнуліся з Лівана, дзе былі з міратворчай місіяй. На працягу года медсёстры працавалі ў інтэрнацыянальным шпіталі, які знаходзіцца на тэрыторыі ваеннай базы. На поўдні краіны — па-ранейшаму неспакойна, таму людзі ў пагонах, асабліва мясцовыя жыхары, рады любой дапамозе, а тым больш кваліфікаванай.

## Калі і медык, і вайсковец

У Ліване Вольга была ўжо трэці раз, Вера — другі. Сказаць, што гэтая краіна на Блізкім Усходзе стала для іх амаль роднай, дзяўчаты не бяруцца. Што не кажы, а ўсё роўна цягне дамоў. Але раз ужо надзеў пагоны, то сам сабе мала належыш.

— Я з самага дзяцінства марыла быць або ўрачом, або вайскоўцам, — прызнаецца старшына кантрактнай службы Вольга Яхнавец. — Паколькі дзяўчат у армію не бралі, паступіла ў Мінскі дзяржаўны медыцынскі каледж. Толькі яго скончыла, як даведалася, што ў ваенным шпіталі фарміруюць атрад спецыяльнага прызначэння. Удача была на маім баку.

Вера ж, перш чым трапіць у атрад, паспела набрацца вопыту ў гарадской бальніцы ў Жодзіне, а пасля ў дзіцячым анкалагічным цэнтры ў Бараўлянах. «Калі я прыйшла ў шпіталь, то прасілася на актыўны ўдзел у працы табаты: прызвычаілася працаваць са складанымі пацыентамі, — кажа медсястра. — Мне прапанавалі пасаду анестэзісткі. Яшчэ ў Бараўлянах я зацікавілася гэтай спецыяльнасцю, распытвала ў калег пра тонкасці прафесіі».



Пра тое, што Вольга і Вера святкуюць Дзень Перамогі, на тэрыторыі ваеннай базы ведалі ўсе.

## Аперацыйная на калёсах

У медыцынскім атрадзе спецыяльнага прызначэння дзяўчаты служаць ужо не першы год. Яны заўжды там, дзе праходзяць вучэнні. Раптам хтосьці атрымае траўму? Не везці ж у Мінск, калі спатрэбіцца і экстраннае хірургічнае ўмяшанне! Што ўжо казаць пра першую медыцынскую дапамогу.

— Мабільны палявы шпіталь мы можам разгарнуць дзе заўгодна, — расказваюць медсёстры. — Комплекс складаецца з аперацыйнай, рэанімацыі, перавязачнай, прыёмнага аддзялення. Акрамя таго, у палявых умовах магчыма зрабіць рэнтген, правесці ўльтрагукавую дыягностыку, чалавек можа здаць і элементарныя аналізы, якія аператыўна расшыфруе пераносная лабараторыя.

Але і па-за выездамі ў поле ў дзяўчат хапае работы. Як і звычайныя медыкі, яны дапамагаюць хворым у аперацыйнай, а таксама ў аддзяленні рэанімацыі і анестэзіялогіі. У іх такія ж змены, дзяжурствы, як і ў астатніх калег. Толькі, згодна са сваёй кваліфікацыяй, медыцынскую дапамогу яны павінны быць гатовы аказаць і днём, і ноччу, у любой форсмажорнай сітуацыі.

## Моўны бар'ер і платная медыцына

У Ліван дзяўчаты ездзілі ў складзе брыгады: два дактары, яны і афіцэр са штаба. Адных жадання і ўрачэбнай практыкі, каб трапіць у міратворчую місію, недастаткова. Без ведання англійскай мовы там няма чаго рабіць: штодзень ты маеш зносіны з мясцовым насельніцтвам, калегамі з іншых дзяржаў, якія таксама знаходзяцца там па праграме ААН.

— Часам прыходзяць мясцовыя жыхары, якія ўвогуле не ведаюць англійскай мовы, а табе трэба хаця б зразумець, што ім баліць, — расказвае Вера Паўлянковіч. — Давodзілася карыстацца жэстамі, а потым і вывучыць пэўныя арабскія фразы, каб мінімальна кантактаваць з ліванцамі. Здавалася б, з калегамі ў гэтым плане прасцей, але англійская мова індусаў, ірландцаў і тых жа аўстрыйцаў істотна адрозніваецца ад таго, як прызвычаіліся гаварыць мы.


У перавязачнай.

Вера не хавае, што за час місіі настолькі адвыкла размаўляць на роднай мове, што пасля вяртання ў Беларусь нават думала па-англійску. А дзесьці за мяжой, спадзяюцца дзяўчаты, у той час гучаць родныя «дзякуй» або «добрай раніцы». «Калегам з іншых краін настолькі спадабалася наша мова, што часцяком пыталіся, як тое ці іншае слова будзе па-беларуску, — у адзін голас кажуць медсёстры. — У Ліване ўвогуле беларусаў любяць і паважаюць».

Паколькі шпіталь знаходзіцца на тэрыторыі ваеннай базы, то ў першую чаргу там абслугоўваюць ваеннаслужачых. Але на памяці дзяўчат не было ніводнага выпадку, каб у медыцынскай дапамозе адмовілі мясцоваму насельніцтву. Больш за тое, апошнія, а асабліва бежанцы, якіх на поўдні Лівана нямала, ведаюць гэта і наўмысна ідуць да ўрачоў шпіталя. Па-першае, таму, што, у адрозненне ад усіх астатніх устаноў аховы здароўя краіны, медыцынская дапамога там бясплатная для ўсіх, а па-другое, ліванцы вельмі давяраюць прафесіяналізму замежных медыкаў.

— Мясцовыя ўрачы, якія ў свой час атрымлівалі адукацыю ў СССР, там цэняцца, ім давяраюць, — расказвае Вольга Яхнавец. — У Ліване вельмі добра развіта медыцына, але людзям за ўсё даводзіцца плаціць: пачынаючы ад уколу, заканчваючы аперацыяй.

## Недасягальнае мора і «трывожны чамаданчык»

Ваенны лагер, дзе жылі дзяўчаты, знаходзіцца побач з Міжземным морам. Але гэта абсалютна не азначае, што кожную вольную хвілінку яны адзявалі купальнікі і беглі на пясчаны пляж.

— Прачынаешся, а за акном мора шуміць, толькі трапіць на яго не можаш, — развенчвае ўсе міфы Вольга. — Прамога выхаду да вады лагер не мае, а пайсці да мора без дазволу нельга. Каб вы разумелі, уваход і выхад за тэрыторыю базы — строга па пропусках.

Каб заўсёды быць на сувязі, міратворцы аснашчаны дэкфонамі — прыладамі, падобнымі да пэйджараў. За тым, каб усе машыны, якія выехалі раніцай, абавязкова вярнуліся на базу да вечара, вельмі пільна сочаць. Хочаш выйсці на кірмаш або ў краму — абавязкова папярэдзь. Ды і хадзіць па адным забаронена: можна заблукаць або сустрэць узброеных ліванцаў.

Як прызнаюцца дзяўчаты, па першым часе, канешне, было страшна. Але калі ўсяго баяцца, то ўвогуле цяжка жыць. Родных, вядома, гэта мала супакойвае, таму ваеннаслужачыя імкнуліся быць на сувязі кожны дзень.

— Аднойчы ў лагеры аб'явілі трывогу, — успамінае Вера. — З боку Ізраіля і Палесціны была выпушчана ракета, якая трапіла ў іспанскі лагер. Адзін з вайскоўцаў, які знаходзіўся на баявым пасту, загінуў. Пра інцыдэнт паведамілі і ў беларускіх СМІ. Мама тэлефануе, а ў мяне, як на зло, сувязі няма. Неяк звязалася з сястрой. Дзеля таго, каб супакоіць родных, папрасіла сказаць, што ўсё гэта адбылося не ў нас, а ў Ліві. Але маму не падманеш...

У выпадку трывогі міратворцы размяшчаюцца ў шалтарах — так званых бункерах. Адзяваюць бронекамізэльку, каску, у кожнага — «трывожны чамаданчык», у якім ёсць самае неабходнае: вада, ежа, сродкі гігіены, зменная вопратка, аптэчка. Падчас надзвычайнай сітуацыі ваенныя медыкі павінны прыбыць у шпіталь, каб у выпадку масавага паступлення пацярпелых было каму аказваць дапамогу.

## Бульбяныя сушы і туга па снезе

Такія сітуацыі ў Накуры, дзе з міратворчай місіяй былі дзяўчаты, хутчэй выключэнне, чым правіла. Тым не менш бяспека — перш за ўсё. Але гэта абсалютна не азначае, што жыццё ў ваенным лагеры абмяжоўвае іх свабоду. На тэрыторыі пабудавана некалькі крам, дзе можна набыць самае неабходнае, працуюць спартыўныя залы, тэнісны корт, ёсць футбольнае поле, нават функцыянуюць кафэ. Як жартуюць дзяўчаты, традыцыя выпіць кавы, напэўна, ёсць ва ўсіх краінах.

Міратворцы ж харчуюцца ў сталовай, якая знаходзіцца на тэрыторыі базы. Але, як прызнаюцца медыкі, вострая, насычаная спецыямі ежа рана ці позна прыядаецца, таму вельмі хочацца адчуць смак звыклых страў. А паколькі такое жаданне ўзнікала ўсё часцей, Вера і Вольга абсталявалі ў сваім пакойчыку міні-кухню, дзе з задавальненнем гатавалі тое, што елі дома: бульбу, боршч, юшку, пельмені, бліны...

— Давялося неяк пачаставаць італьянцаў смажанай бульбай з цыбуляй, — расказваюць медсёстры. — І хто б мог падумаць, што гэтым гурманам настолькі спадабаецца, што нават рэцэптам давядзецца дзяліцца! Дзівіліся замежнікі і з таго, што бліны могуць быць і несалодкімі. Увогуле, усе, хто каштаваў прыгатаваную намі ежу, прасіў у кухараў сталовай ладзіць дні беларускай кухні. А кітайцы так хацелі нам дагадзіць, што запрасілі на сушы, прыгатаваныя з... бульбянога пюрэ.

Увогуле, атмасфера ў лагеры была вельмі дружалюбная. Міратворцы з розных краін не толькі частавалі адзін аднаго, але і разам займаліся спортам, адзначалі святы. Не забываліся пра нацыянальныя ўрачыстасці і беларусы. Кожнае 9 Мая і Дзень Незалежнасці наша дэлегацыя абазначала сябе знаёмымі нам значкамі з беларускім сцягам і яблыневай кветкай.

— Гэта выклікала цікавасць у нашых калег, — працягваюць дзяўчаты. — Некаторым даводзілася расказваць пра значэнне гэтых святых для беларусаў дат. Потым, пачытаўшы пра Беларусь у інтэрнэце, тыя здзіўлена казалі: «Як крута, што ў вас ёсць Брэст!»

Нягледзячы на вельмі дружалюбную атмасферу і вялікі прафесійны вопыт, медыкаў у пагонах вельмі цягнула на Радзіму. «Больш за ўсё я сумавала па родных і, як не дзіва, па снезе, — кажа Вера Паўлянковіч. — Калі Новы год можна было кампенсаваць мандарынамі (яны там надзвычай смачныя), то на фотаздымкі заснежаных вуліц і прыбраных ёлак, якія нам дасылалі, глядзелі з зайздрасцю».

— У Ліване ж у асноўным спёка, — працягвае Вольга Яхнавец. — Ёсць невялікі перыяд, які называецца ліванскай зімой: гэта калі на працягу некалькіх тыдняў або месяцаў ідуць дажджы. Многія, асабліва індусы, былі ўражаны, калі даведаліся, што ў Беларусі — чатыры пары года і кожная прыгожая па-свойму. Яны не маглі зразумець, як праз некалькі месяцаў пасля зімы наступае вясна, а пасля гарачыні можа ісці снег. Каб убачыць усё на ўласныя вочы, нашы калегі, з кім мы пасябравалі, паабяцалі, што абавязкова прыедуць у Беларусь. Адных чакаем ужо ў маі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Гвардзейцы

# ПОДЗВІГ НА ДВАІХ

## Радавым запасу, якія вясной выратавалі адзін аднаму жыцці, уручылі медалі «За адвагу»

**Той сонечны дзень для брэсцкіх дэсантнікаў запомніцца на ўсё жыццё. Пра такіх кажуць: нарадзіліся ў кашулі. Сапраўды, 5 красавіка 2017 года стала другім днём нараджэння для Дзмітрыя Страчука і Яўгена Жарскага, на той час вайскоўцаў 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады.**



**Міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ уручае медаль «За адвагу» Дзмітрыю СТРАЧУКУ.**

**Дарэчы**

Падобны выпадак адбыўся ў 2004 годзе, калі падчас вучэбна-трэніровачных заняткаў пры ажыццяўленні скачкоў з парашутам ваеннаслужачы 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння радавы Уладзімір Цішкевіч выратаваў жыццё саслужыўцу. Указам Прэзідэнта Беларусі хлопец быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Пра тое, што падчас ваеннага вучэння ў Шумілінскім раёне магло здарыцца непапраўнае, мінулай вясной прагучала бадай з усіх СМІ. Пры ажыццяўленні скачкоў з Іл-76 з-за моцнага павеву ветру адбылося сыходжанне парашутаў. У аднаго з іх патух асноўны купал...

Лічаныя секунды — і Яўген Жарскі мог бы паляцець уніз. Але імгненная рэакцыя і добрая падрыхтоўка Дзмітрыя, які зафіксаваў рукамі асноўны купал парашута саслужыўца, зрабілі пасадку больш мяккай для абаіх.

За тымі скачкамі з парашутамі, якія адназначна ўвайшлі ў гісторыю, па меншай меры беларускай арміі, назіраў і **камандуючы сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл генерал-маёр Вадзім ДЗЕНІСЕНКА.**

— Мы бачылі, як усё адбывалася, і гэта было выпрабаваннем для нас, — прызнаўся пазней камандуючы. — Назіраючы за хлопцамі ў паветры, мы разумелі, што яны навучаныя і змогуць справіцца з сітуацыяй. Канешне, гонар за нашых ваеннаслужачых перапаўняе. Самае галоўнае, што адзін з іх не пакінуў таварыша ў бядзе. Нават цяпер, калі пагутарыць з імі, яны не да канца ўсведамляюць, што здзейснілі подзвіг.

І гэта праўда. Сваімі дзеяннямі ў экстрэмальнай сітуацыі хлопцы выратавалі жыццё адзін аднаму. Калі да Дзмітрыя Страчука ў першыя ж дні пасля выпадку была прыкавана ўвага вайсковых начальнікаў і журналістаў, то Яўген Жарскі канчаткова паверыў у гэта, калі стаяў на пляцы 38-й дэсантна-штурмавой брыгады ў Брэсце, дзе на днях міністр абароны ўручыў яму і яго таварышу медалі «За адвагу».

Як адзначыў **генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**, радавыя, якія пры дэсантаванні выручылі адзін аднаго, праявіўшы найвышэйшую якасць падрыхтоўкі ў найскладанейшай сітуацыі, атрымалі свае заслужаныя ўзнагароды. Акрамя таго, міністр абароны выказаў словы ўдзячнасці як героям, якія здзейснілі подзвіг, так і іх бацькам, якія выхавалі сваіх сыноў сапраўднымі абаронцамі Айчыны.

Аб тым, што сын выратаваў жыццё таварышу, бацькі Дзмітрыя Страчука даведаліся з газет і інтэрнэту. Як прызнаецца маці хлопца Наталля Міхайлаўна, вельмі перажывалі, асабліва за Жэню. На наступны дзень звязаліся з сынам, але ён не быў красамоўны. Хлопец і сёння не любіць расказваць пра той дзень, хоць памятае яго, здаецца, пасекундна.

Разам з бацькамі Дзіма жыве ў вёсцы Тамашоўка, што ў Брэсцкім раёне. Як і ўся сямейнікі, працуе ў сельскай гаспадарцы. Цяпер хлопец — мясцовая славутасць. Але і да арміі бацькам не даводзілася за яго чырванець: Дзіма доўгі час займаўся лёгкай атлетыкай, мае шмат спартыўных узнагарод.

Падзеі таго лёсавызначальнага дня Яўген Жарскі ўспамінае толькі да моманту, калі сеў у самалёт. Што адбывалася потым, быццам нехта выкрасліў з яго памяці. Для Жэні гэта быў трэці і апошні скачок з парашутам. Дагэтуль дэсантаваўся з верталёта Мі-8. Па словах хлопца, паўтарыць скачок з Іл-76 складаней — большая хуткасць. А, між іншым, да арміі Яўген баяўся вышыні, але ўсё роўна марыў быць толькі дэсантнікам — каб і ў элітных войсках служыць, і свой страх перамагчы.



Фота Ірыны МАЛІНОЎСКАЙ.

**Дзмітрый СТРАЧУК і Яўген ЖАРСКІ цяпер героі не толькі 38-й дэсантна-штурмавой брыгады.**

Пра тое, што здарылася ў небе над Шуміліншчынай, маці Яўгена паведамілі ў той жа дзень. Патэлефанавалі з вайсковай часці, сказалі, што Жэня атрымаў траўму і знаходзіцца ў 432-м Галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных Сіл.

— Калі мы прыехалі ў ваенны шпіталь, то вельмі перажывалі, бо сын быў у крытычным стане, — успамінае Валянціна Віктараўна. — Уся вёска малілася за Жэню. І калі б не высокі прафесіяналізм урачоў і медыцынскага персаналу аддзялення рэанімацыі і траўматалогіі, якім мы вельмі ўдзячны, хто ведае, чым бы ўсё скончылася...

Да ранейшага жыцця Яўген вярнуўся ў верасні. Як і да арміі, працуе на Баранавіцкім заводзе аўтаматычных ліній. Калегі яго чакалі з нецярпеннем: перажывалі за маладога таварыша, добрага спецыяліста. На днях хлопец упершыню за доўгі час зноў надзеў ваенную форму: у той красавіцкі дзень служба для Жэні скончылася. Якое ж хваляванне ён адчуў, калі прыбыў у родную часць, няёмкасць — калі ў музеі брыгады, а таксама ў батальёне, дзе служыў, убачыў плакат, на якім расказваецца пра подзвіг, які для гэтых хлопцаў стаў другім шанцам на жыццё.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ З нагоды

# Тыя, хто не памыляецца

**У гэтую нядзелю прафесійнае свята адзначаюць прадстаўнікі інжынерных войскаў нашай краіны. Праца гэтых людзей звязана з велізарнай рызыкай нават у мірны час. Менавіта яны прымушаюць сціхаць «рэха вайны» — ліквідуюць выбухоўную спадчыну Вялікай Айчыннай, якую ўсё яшчэ можна знайсці на беларускай зямлі. Як кажуць самі ваенныя, у падраздзяленнях інжынерных войскаў заўсёды павінны быць разуменне і зладжанасць: часам ад дзеянняў аднаго чалавека залежыць жыццё многіх астатніх.**

— Так гістарычна склалася, што 21 студзеня інжынерныя войскі адзначаюць сваё прафесійнае свята: у гэты дзень у 1701 годзе па ўказе Пятра І у Маскве была створана першая інжынерная школа, дзе пачалася падрыхтоўка афіцэраў гэтых войскаў, — расказаў **начальнік інжынерных войскаў — начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй КУРАКОЎ.**

Праца сапёраў уносіць вялікі ўнёсак у мірнае жыццё беларускага грамадства. У пасляваенны перыяд было абясшкоджана больш за 27 млн выбухованебяспечных прадметаў. А гэта амаль па тры выбуховыя прыстасаванні на кожнага сучаснага беларуса. І работа пастаянна працягваецца.

«Летась 30 рухомых груп па размініраванні знішчылі больш за 23 тысяч выбухованебяспечных прадметаў. У 2017 годзе каля вёскі Паўлаўка Слуцкага раёна інжынерныя войскі ачысцілі ад выбухованебяспечных прадметаў больш за 70 гектараў зямлі, усяго за год — на тэрыторыі Беларусі каля 1200 гектараў. Работу плануецца працягнуць ужо вясной. Усяго ж на гэтай тэрыторыі прайшлі ўжо чатыры суцэльныя чысткі. Колькі часу яшчэ зоймуць работы, казаць складана, паколькі грунт мае ўласцівасць «выціскаць» прадметы на паверхню вясной і восенню», — дадаў Андрэй Куракоў.

Фронт работы вялікі, патрэбна спецыяльная тэхніка. З гэтым у інжынерных войсках сёння праблем няма. На працягу апошніх гадоў на ўзбраенне было пастаўлена больш за 50 адзінак інжынернай тэхнікі: гэта перш за ўсё экскаватары, аўтамабільныя краны, пагрузчыкі рознага тыпу, — усе ўзоры менавіта айчыннай вытворчасці. Акрамя таго, у апошні час інжынеры карыстаюцца 54 новымі сродкамі пошуку і разведкі мінна-выбуховых загарод — мінашукальнікаў. Варта дадаць, што інжынерныя войскі па ўзроўні тэхнічнай аснашчанасці ва Узброеных Сілах займаюць адно з першых месцаў.

Начальнік упраўлення інжынерных войскаў распавёў, што мінулы навучальны год быў вельмі насычаны. Дзве каманды інжынерных войскаў удзельнічалі ў «Армейскіх міжнародных гульнях»: у конкурсах «Бяспечны маршрут» і «Інжынерная формула». У абодвух нашы каманды занялі другія месцы, саступіўшы толькі расіянам. Акрамя таго, у 2017 годзе ў Арменіі на палігоне «Баграмян» зборная каманда інжынерных войскаў краіны ўвайшла ў лік прызёраў і заняла другое месца. Таксама нашы пантанёры паўдзельнічалі з расійскімі калегамі ў сумесных вучэннях дзвюх краін, дзе на практыцы праверылі сумяшчальнасць расійскай і беларускай тэхнікі. Зрабілі гэта на ацэнку «выдатна» па ўсіх нарматывах.

Сёлета, як запэўніў начальнік упраўлення інжынерных войскаў, тэмпы змяншаць ніхто не збіраецца.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** kryzhevich@zviazda.by

■ З гісторыі маёй сям'і

# Калі прадзед — Герой

## Невядомыя факты з біяграфіі ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны дапамаглі высветліць сучасныя тэхналогіі



**Герой Савецкага Саюза Дзмітрый ЛУГАЎСКОЙ.**

**Мой прадзед, Герой Савецкага Саюза Дзмітрый Іванавіч Лугаўской, нарадзіўся ў 1918 годзе ў Віцебску. З самага дзяцінства ён захапляўся самалётамі, нават займаўся ў аэраклубе. У 1940 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію, але любоў да паветра прымусіла юнака скончыць знакамітую Чкалаўскую школу пілотаў, якая была размешчана ў Арэнбургу.**

Неверагодна, але ў гады Вялікай Айчыннай вайны мой прадзед, абараняючы сваю радзіму, здзейсніў 130 баявых вылетаў, знішчыў 10 фашысцкіх танкаў, 26 гармат і бронемашын, 80 аўтамашын з войскамі і грузам. Вайна скончылася, а Дзмітрый Іванавіч застаўся служыць у авіяцыі камандзірам знішчальнага авіяпалка рэактыўнай авіяцыі. У адстаўку выйшаў у званні палкоўніка, здабыўшы мноства ўзнагарод: ордэны Чырвонага Сцяга, Леніна, двойчы — Чырвонай Зоркі, меў і ордэн Аляксандра Неўскага, атрымаць які ў той час мог толькі адважны воін з каманднага саставу.

Я шмат чула аб прадзедавых подзвігах, але недастаткова. Падрабязнасці вырашыла высветліць з дапамогай сайта «Памяць Народа», дзе сабрана інфармацыя аб героях Вялікай Айчыннай вайны. Увёўшы ў пошуку імя, прозвішча і імя па бацьку майго продка, я цярпліва чакала вынікаў. У тую ж секунду сайт выдаў мне 29 дакументаў, якія з цікавасцю пачала вывучаць.

«За выдатнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі на Закаўказскім і Паўночнакаўказкім франтах...», — гэтыя словы выклікалі прыемную цеплыню ў маім сэрцы, а ўсведамленне таго, што подзвігі майго прадзеда ацэнены найвышэйшай узнагародай, не магло не радаваць. З кожным дакументам, які мне трапляўся на вочы, мяняецца яго воінскае званне: радавы, старшына, лейтэнант, старшы лейтэнант. Гонар проста перапаўняў. У тую ж секунду я вельмі пашкадавала, што не ведала гэтага чалавека асабіста.

Па аповедах майго дзядулі Леаніда, прадзед быў вельмі клапатлівы чалавек, любіў сям'ю. «Памятаецца, як бацька браў нас з братам на паляванне, і пакуль ён выглядваў качак, мы з Алегам захапляліся яго майстэрствам, — расказвае сын Героя. — А калі разам хадзілі ў грыбы, то яму проста не было роўных».

Усё жыццё Дзмітрыя Лугаўскога было звязана з Ваенна-паветранымі сіламі. Больш за авіяцыю ён любіў толькі сваю сям'ю. Пасля таго, як выйшаў у адстаўку, навучэнцы многіх школ атрымалі магчымасць пачуць пра вайну з першых вуснаў. Памёр Дзмітрый Іванавіч у маі 1988 года ва ўзросце 70 гадоў: пажыць даўжэй не дало здароўе, падараванае Вялікай Айчыннай.

Тым, хто таксама зацікавіўся гісторыяй сваіх продкаў, рэкамендую скарыстацца электроннымі дакументамі, выкладзенымі ў сецiва Цэнтральным архівам Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Інфармацыя, змешчаная на сайтах *pamyat-naroda.ru, podvignaroda.ru* або *obd-memorial.ru*, абавязкова задаволіць вашу цікаўнасць ці проста стане прыемнай навіной для кожнага, хто вывучае гісторыю свайго роду.

**Настасся СУРЫНАВА, вучаніца 10 «А» класа гімназіі № 8 г. Мінска.**

БПС-СБЕРБАНК

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ДОСТАВКА УДАЧИ ОТ СБЕРБАНКА»

**1. Организатор Рекламной игры.**

Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223054, Минская обл., Минский р-н, аг. Острошицкий Городок, ул. Ленина 1–3, каб. 3–1–14. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**2. Наименование Рекламной игры.**

Рекламная игра, проводимая Организатором, носит название «Доставка удачи от Сбербанка».

**3. Территория проведения Рекламной игры.**

Рекламная игра «Доставка удачи от Сбербанка» проводится на территории РБ на сайте e-dostavka.by.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

Рекламная игра проводится с 23 января 2018 года по 21 апреля 2018 года (включая период розыгрышей и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель комиссии – Реут Юрий Леонидович, директор ООО «360 медиа групп»;

Заместитель председателя комиссии – Павлович Ирина Сергеевна, директор по качеству ООО «360 медиа групп»;

Члены комиссии:

1. Багдюк Алеся Вячеславовна, зам. директора ООО «360 медиа групп»;

2. Демиденко Елена Викторовна, исполнительный директор ОАО «БПС-Сбербанк»;

3. Липский Арсений Адамович, пресс-секретарь ОАО «БПС-Сбербанк».

Данная комиссия создана для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры.

**6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Игра проводится в целях стимулирования интернет-платежей банковскими платежными картами Visa ОАО «БПС-Сбербанк» на сайте e-dostavka.by.

**7. Участники Рекламной игры.**

7.1. Граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет на момент совершения безналичной операции, соответствующей условиям настоящих Правил.

7.2. Иностранные граждане, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и достигшие 18 лет на момент совершения безналичной операции, соответствующей условиям настоящих Правил.

7.3. Лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и достигшие 18 лет на момент совершения безналичной операции, соответствующей условиям настоящих Правил.

7.4. Лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь и достигшие 18 лет на момент совершения безналичной операции, соответствующей условиям настоящих Правил.

7.5. Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии и лица, состоящие в трудовых отношениях с ОАО «БПС-Сбербанк».

**8. Условия участия в Рекламной игре:**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 23 января 2018 года по 22 марта 2018 года включительно:

8.1. Совершить с использованием банковской платежной карты Visa, выпущенной ОАО «БПС-Сбербанк», оплату заказа через интернет на сайте e-dostavka.by (далее – «Интернет-платеж»);

8.2. При оформлении заказа выбрать вариант оплаты «Оплатить Visa ОАО «БПС-Сбербанк» и участвовать в рекламной игре». Этим действием покупатель подтверждает свое участие в Рекламной игре, а также согласие на передачу Организатору следующих данных: ФИО (полностью), контактный телефон, email (будут использованы Организатором при уведомлении участника о выигрыше), дата совершения интернет-платежа;

8.3. Получить email-подтверждение о совершении интернет-платежа.

Сохранить email-подтверждение в течение всего периода проведения Рекламной игры.

Каждый интернет-платеж, соответствующий условиям Рекламной игры, участвует в розыгрыше. Один интернет-платеж может принимать участие в Рекламной игре только один раз.

**9. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора. Общий размер Призового фонда составляет 8 853 (восемь тысяч восемьсот пятьдесят три) бел. рублей 85 (восемьдесят пять) копеек.

| № | Наименование | | Кол-во, шт. | Цена единицы с НДС, в бел. руб. | Всего с НДС, в бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Телевизор LED LG 49LJ540V | Далее «телевизор» | 5 | 1 120,00 | 5 600,00 |
| | Денежный приз для уплаты подоходного налога | | | 150,77 | 753,85 |
| 1 | Сертификат e-dostavka. Срок действия сертификата с 15.04.2018 в течение 90 календарных дней | Далее «сертификат» | 25 | 100,00 | 2 500,00 |
| | **Итого:** | | | | **8 853,85** |

**10. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравшего участника Рекламной игры.**

10.1. К моменту розыгрыша данные об Участниках Рекламной Игры (т. е. лицах, которые осуществили действия, предусмотренные п. 8 настоящих Правил) формируются в Список Участников. Каждому Участнику Рекламной игры в Списке Участников последовательно присваивается индивидуальный порядковый номер по дате и времени интернет-платежа. Все порядковые номера имеют одинаковую разрядность.

10.1.1. Розыгрыш Призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии **27 марта 2018 года в 12.00** по адресу: г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6, кабинет 420, среди участников, которые выполнили условия Правил Рекламной игры.

10.1.2. В розыгрыше будут разыграны призы в последовательности, указанной в п. 9 данных правил.

10.2. Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Из состава Комиссии выбирается секретарь для извлечения шаров из барабана.

Определение выигрышного номера получателя Приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

10.3. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника игры в списке. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

10.4. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Списке Участников и при наличии совпадения номера вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Списке Участников.

10.5. Таким же образом выбирается 30 (тридцать) резервных победителей Рекламной игры (по одному резервному победителю на каждый приз).

**11. Срок и способ информирования выигравшего Участника, порядок вручения приза**.

11.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителей о выигрыше приза посредством направления уведомления по email и уведомлением по телефону **до 30 марта 2018 года включительно.**

11.2. Призы вручаются Победителям лично в период **с 2 апреля 2018 года по 11 апреля 2018 года включительно** в рабочие дни, по предварительной договоренности, по адресу г. Минск, бульвар Мулявина 6, каб. 420. В субботу 7 апреля 2018 года, в промежутке с 11.00 до 14.00, по предварительной договоренности, по адресу г. Минск, пр. Победителей, 9, 19-й этаж, офис 59.

При получении приза необходимо предъявить Организатору документ, удостоверяющий личность (паспорт), email-уведомление о выигрыше (в электронном или распечатанном виде), подтверждение выигравшего интернет-платежа. Фактом получения Победителем приза является ведомость или акт передачи приза, подписанный Победителем.

11.3. В случае если Победитель розыгрыша не явился за получением приза в указанные сроки (ввиду его отъезда, смены места жительства и/или телефона, болезни и др.), победитель теряет право на получение приза, право на приз переходит к резервному победителю.

11.3.1. Организатор уведомляет резервного победителя о выигрыше приза посредством направления уведомления по email и уведомлением по телефону **до 13 апреля 2018 года включительно**.

11.3.2. Призы вручаются резервным победителям лично в период **с 16 апреля 2018 года по 20 апреля 2018 года включительно** в рабочие дни, по предварительной договоренности, по адресу г. Минск, бульвар Мулявина, 6, каб. 420. В субботу 21 апреля 2018 года в промежутке с 11.00 до 14.00 по предварительной договоренности, по адресу г. Минск, пр. Победителей, 9, 19-й этаж, офис 59.

При получении приза необходимо предъявить Организатору документ, удостоверяющий личность (паспорт), email-уведомление о выигрыше (в электронном или распечатанном виде), подтверждение выигравшего интернет-платежа. Фактом получения Победителем приза является ведомость или акт передачи приза, подписанный Победителем.

11.4. В случае если резервный победитель розыгрыша не явился за получением приза в указанные сроки (ввиду его отъезда, смены места жительства и/или телефона, болезни и др.), резервный победитель теряет право на получение приза, приз остается в распоряжении Организатора.

11.5. Победитель вправе передать право на получение приза другому лицу в соответствии с указанными в данных правилах сроками выдачи призов, письменно извещая организатора посредством предоставления заявления с приложением копии паспорта победителя и лица, которому будет осуществляться передача приза.

11.6. Победитель теряет право получения Приза в случае если:

– отказался от получения Приза, о чем письменно известил Организатора Игры,

– не предоставил необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

– не выполнил все условия Игры, установленные Правилами.

11.7. Денежная компенсация стоимости приза не производится.

11.8. В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении всех призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

11.9. Организатор не несет ответственности за возникновение необходимости уплаты дополнительного подоходного налога и иных выплат, связанных с получением Призов, за пределами Республики Беларусь.

11.10. Победители Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения приза.

11.11. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, возникшие после передачи Призов Победителям.

**12. Порядок информирования об условиях и результатах Рекламной игры.**

12.1. Правила проведения Рекламной игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Рекламной игры в газете «Звязда», а также размещаются на сайте Организатора **www.360.by**.

12.2. Сведения о результатах розыгрыша публикуются до 18 апреля 2018 года включительно в газете «Звязда», а также размещаются на сайте Организатора **www.360.by**. Телефон для справок + 375 17 239 07 34.

**13. Общие условия Рекламной игры.**

13.1. Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

13.2. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

13.3. Участвуя в Рекламной игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре в рамках Рекламной игры.

13.4. Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи приза должны быть адресованы непосредственно Организатору Рекламной игры по адресу: 223054, Минская обл, Минский р-н, аг. Острошицкий Городок, ул. Ленина 1–3, каб. 3–1–14. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

13.5. Информацию об условиях участия и правилах проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии»: + 375 17 239 07 34 в период с 23 января 2018 года по 21 апреля 2018 года (включительно) с 9.00 до 21.00.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3196 от 17.01.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «2566 завод по ремонту радиоэлектронного вооружения», находящегося в собственности Республики Беларусь

**Лот № 1**. Помещение кафе с инв. № 610/D-63675, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Гагарина, 56-3, 1987 г. п. Назначение: помещение общественного питания. Общая / нормируемая площадь – 187,40 / 150,10 кв. м. Этаж – подвал.

**Начальная цена с НДС 146 788,32 бел. руб. Задаток 5 000,00 бел. руб.**

Обременение: помещение кафе с инв. № 610/D-63675 сдается по договору аренды на срок до 09.04.2019 (187,4 кв. м)

Земельный участок для данного изолированного нежилого помещения с инвентарным номером 610/D-63675 будет сформирован после заключения договора купли продажи

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3 % (три процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 01.02.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец**: ОАО «2566 завод по ремонту радиоэлектронного вооружения», 222511, Минская обл., г. Борисов, ул. Гагарина, 54, тел. 8 (0177) 74-47-27.

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже помещения кафе, продаваемого ОАО «2566 завод по ремонту радиоэлектронного вооружения», проводимом 1 февраля 2018 г.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 30.01.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Криштапович Виктор Владимирович, тел.: 8 (0177) 74-47-25, 8 (029) 674-79-75 (осмотр осуществляется в рабочие дни с 13.30 до 17.00)

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** ОАО «Витебский плодоовощной комбинат», 211301, Республика Беларусь, Витебская район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д. 9

**Наименование предмета торгов, начальная цена с учетом НДС, задаток**

Лот № 1. Грузовой вагон Volkswagen LT35, 1992 г. в., гос. номер AA 0606-2. Начальная цена: 2 268 руб. Задаток: 226,80 руб.

Лот № 2. Грузопассажирский вагон Hyundai H-200, 2001 г. в., гос. номер AE 1427-2. Начальная цена: 6 132 руб. Задаток: 613,20 руб.

Лот № 3. Легковой джип Lada 21310-120-40, 2012 г. в., гос. номер 8896 EB-2. Начальная цена: 5 880 руб. Задаток: 588 руб.

Лот № 4. Грузовой фургон МАЗ 54329, г. в. не определен, гос. номер AB 3493-2. Начальная цена: 6 384 руб. Задаток: 638,40 руб.

Лот № 5. Автобус ПАЗ 32053, 2008 г. в., гос. номер AB 3724-2. Начальная цена: 3 108 руб. Задаток: 310,80 руб.

Лот № 6. Прицеп тракторный 2ПТС-4 1994 г. в., гос. номер 8450 БХ. Начальная цена: 2 016 руб. Задаток: 201,60 руб.

Лот № 7. Вышка самоходная GS-2632, инв. № 1257. Начальная цена: 10 332 руб. Задаток: 1 033,20 руб.

Лот № 8. Смородоуборочный комбайн Jarek, инв. № 4845. Начальная цена: 28 308 руб. Задаток: 2 830,80 руб.

Лот № 9. Погрузчик «Амкодор» Е16, инв. № 4872. Начальная цена: 16 548 руб. Задаток: 1 654,80 руб.

Лот № 10. Вакуум-выпарная установка М32с-320, инв. № 4861. Начальная цена: 2 520 руб. Задаток: 252 руб.

Лот № 11. Вакуум-выпарная установка М32с-320/2, инв. № 4862. Начальная цена: 2 520 руб. Задаток: 252 руб.

Лот № 12. Вакуумно-выпарной аппарат МЗС 241А-1, инв. № 4887. Начальная цена: 2 772 руб. Задаток: 277,20 руб.

Лот № 13. Пресс, инв. № 311. Начальная цена: 2 604 руб. Задаток: 260,40 руб.

Лот № 14. Линия мойки 2105 А6446014101, инв. № 1501. Начальная цена: 8 064 руб. Задаток: 806,40 руб.

Лот № 15. Бланширователь А9КЕ, инв. № 1573. Начальная цена: 2 268 руб. Задаток: 226,80 руб.

Лот № 16. Чан, инв.№ 4791. Начальная цена: 2 016 руб. Задаток: 201,60 руб.

Лот № 17. Транспортер этикеровочный (одноленточный – 2 шт., направляющий – 2 шт., роликовый – 1 шт.), инв. № 1261. Начальная цена: 1 848 руб. Задаток: 184,80 руб.

Повторные торги состоятся 06.02.2018 в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, Витебская район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д. 9, в ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». Срок внесения задатка и подачи заявлений: с 20.01.2018 с 8.30 по 05.02.2018 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY41-BELB30121214480040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, пр. Победителей, 29, BIC BELBBY2X, УНП 300063727. Получатель платежа: ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. Начальная цена указана с учетом НДС. Условие аукциона: демонтаж и погрузка оборудования осуществляется за счет Покупателя. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 18.10.2017, 05.12.2017

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт.тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

# КІРАЎНІК ВЕСЯЛОСЦІ АБО ДЗЯЖУРНЫ ПА АТРАКЦЫЁНАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адна са спецыяльнасцяў, засвоіць якую беспрацоўным пачалі прапаноўваць толькі летась — дзяжурны атракцыёнаў і гульнявога абсталявання. Няхай вам будзе 7 ці 70 гадоў, калі чуеш такую фармулёўку, здаецца, што работа звязаная з нечым вельмі цікавым і дзіўным. Гэта ж — паркі забаў! Так гэта ці не мы паспрабавалі высветліць, пабываўшы на занятках у першай групы, сабранай з беспрацоўных.

Аказалася, што навучанне праводзіць дзяржаўны цэнтр «Жылкам», які ўваходзіць у структуру міністэрства ЖКГ. Гэты кірунак тут выкладаюць ужо даўно — раней заказчыкам выступаў «Зеленбуд», а вось каб атрымаць магчымасць супрацоўнічаць са службай занятасці насельніцтва трэба было паўдзельнічаць у тэндары. Як расказала **дырэктар цэнтра Кацярына ГАРБАЧОВА**, конкурс для кожнага кірунку праводзіцца асобна. Цяпер «Жылкам» падаў заяўку на 10 спецыяльнасцяў, сярод якіх, напрыклад, дарожны рабочы, маляр, электрагазазваршчык, тэстыравальнік. У сярэднім падрыхтоўка займае ад двух да пяці месяцаў, прычым у гэты перыяд, акрамя лекцыйнага курсу, уваходзіць таксама практыка і выніковы іспыт. Звычайна даходзяць да «фіналу» амаль усе, выключэнне складаюць адзінкі: хтосьці знаходзіць работу, а хтосьці не можа перамагчы сваю ляноту. А без сабранасці не абысціся: заняткі праходзяць кожны дзень і доўжацца па восем гадзін — сапраўдны працоўны дзень.

### «Для мяне гэта вялікі гонар»

Служба занятасці насельніцтва сфарміравала групу з беспрацоўных для навучання на дзяжурнага атракцыёнаў і гульнявога абсталявання ў канцы снежня. Праграма разлічана на чатыры месяцы: новыя спецыялісты будуць цалкам гатовыя да работы якраз да адкрыцця сезона ў парках. А пакуль жа яны заняты тэорыяй. Адкрыўшы дзверы кабінета, на секунду застываеш у здзіўленні. Само паняцце вучобы ніяк не вяжацца з вобразамі дарослых, суровых на выгляд мужчын, якія нешта старанна запісваюць у сшыткі. Гэта пры тым, што ў кожнага з іх ужо ёсць тэхнічная адукацыя: без неабходнай асновы асвоіць досыць вялікі аб'ём ведаў зусім не проста.



Дзяжурны атракцыёнаў і гульнявога абсталявання — спецыяльнасць, засвоіць якую беспрацоўным пачалі прапаноўваць толькі летась.

Трапляем на прадмет «Ахова працы». Выкладчык захоплена распавядае, малюючы схемы на дошцы. З аўдыторыі перыядычна раздаюцца просьбы яшчэ раз паўтарыць апошняе сцвярджэнне — усе вядуць падрабязны канспект — або ціхія выказванні накшталт «Сапраўды, ўсё так і ёсць — з практыкі ведаем». Як расказаў нам **выкладчык цэнтра Васіль ЮШКО**, сярод беспрацоўных сустракаецца розны кантынгент, але дзякуючы досведу, ён навучыўся лёгка імі кіраваць. А таксама без цяжкасцяў вызначаць, хто як сябе праявіць у далейшым. Гэтая група, па словах Васіля Сцяпанавіча, вельмі добрая — шчырае жаданне вучыцца ёсць у большасці. Пакуль мы размаўляем з выкладчыкам за дзвярыма кабінета, у групе пачынаюцца шумныя абмеркаванні. Як быццам зноў у школе!

А вось адважыцца пагаварыць у адкрытую з намі доўга ніхто не можа. У выніку адпраўляюся сама да маладога прадстаўніка, якому, на хвілінку, усяго 40 гадоў. Сяргей Каваленка працаваў па гэтай спецыяльнасці і раней, але з надыхнага часу дзяжурным па атракцыёнах трэба пасведчанне, якое пацвярджае іх кваліфікацыю — вось і пайшоў на вучобу. Па словах Сяргея, за сваё жыццё ён змяніў мноства работ, але гэтая яму падабаецца больш за ўсё. Нягледзячы на тое, што занятак сезонны, ёсць магчымасць у халодную пару года застацца ў парку на падсобныя работы.

— Спадзяюся, экзамен здамо. На самай справе, я даведаўся тут столькі новага. Нешта адназначна нават са школьнай праграмы — тады прапускаў, «хварэў». Хачу сказаць, што для мяне вялікае задавальненне наведваць такія курсы, тым больш, бясплатна. Вядома, ёсць шмат таго, што мне наўрад ці спатрэбіцца, напрыклад, сістэма рухавіка — але цікава ж! — разважае Сяргей, які прыкметна хвалюецца, адказваючы на пытанні. Відаць, што як і ў большасці прысутных, лёс на яго долю выпаў зусім няпросты. Ці гэта абставіны, ці ўласная бязладнасць, хто цяпер разбярэ...

А вось Генадзь Марчанка прыйшоў на курсы, таму што яму, маючы спецыяльнасць электрыка, надакучыла быць дворнікам. Улетку перабіваўся выпадковымі заробкамі, але восенню прыціснула галеча — пачаў шукаць выйсце. Прычым, у адносінах да працы Генадзь аказаўся вельмі пераборлівы: не толькі ён не задавальняў наймальніка на гутарках, але нярэдка здаралася і наадварот. А вось праца на атракцыёнах здалася яму цікавай, таму цяпер мужчына разлічвае на тое, што зрабіў добрае ўражанне на прадстаўніка «Зеленбуда», які ўжо правёў з усімі індывідуальную гутарку. Пры выкананні ўсіх патрабаванняў працаўладкаванне гарантаванае. Што ж, застаецца толькі пажадаць навучэнцам поспеху на іспытах і сіл, не ўпусціць выдатны шанц.

**Начальнік аддзела навучання грамадзян упраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вольга ТАРАСЮК:**

— Права на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў па накіраванні камітэта маюць грамадзяне, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных, а таксама тыя, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў (акрамя грамадзян, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў). Так, у 2017 годзе праводзілася навучанне па 28 прафесіях, спецыяльнасцях, навучальных курсах у дзевяці ўстановах адукацыі 1271 грамадзянін, а з іх 1266 — беспрацоўныя.

Навучанне грамадзян па накіраванні камітэта ў 2018 годзе плануецца па 33 прафесіях, спецыяльнасцях, навучальных курсах. Сёлета ў пералік дададзеныя прафесіі: дарожны рабочы; машыніст электрацягніка, слесар па рамонце рухомага саставу, прадзільшчык, рабочы зялёнага будаўніцтва, слесар-рамонтнік.

Беспрацоўны з яго згоды можа быць накіраваны на навучанне ў адпаведнасці з заяўкай канкрэтнага наймальніка (пры яе наяўнасці), які гарантуе яго працаўладкаванне пасля завяршэння поўнага курса навучання. Так, у 2017 годзе на навучанне з гарантыяй далейшага працаўладкавання былі накіраваны грамадзяне па прафесіі «вадзіцель тралейбуса», «вадзіцель трамвая» «кантралёр-касір, прадавец» «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм», «кухар», «цырульнік».

Зараз служба занятасці камплектуе групу з ліку беспрацоўных па падрыхтоўцы інтэграванай прафесіі «Машыніст электрацягніка, слесар па рамонце рухомага саставу» — выпускнікі атрымаюць адразу дзве прафесіі і змогуць зарабляць больш за 1200 рублёў у месяц. Пасля курсаў усе слухачы будуць працаўладкаваны ў дзяржаўнае прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн». Патрабаванні да кандыдатаў: рэгістрацыя ў якасці беспрацоўнага ў службе занятасці, наяўнасць тэхнічнай адукацыі.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Жыць здарова!

# САНАТОРЫІ ПРЫМУЦЬ «БЯЗВІЗ»

## Гродзенскія здраўніцы рыхтуюць спецыяльны пакет паслуг для гасцей



**З гэтага года ўжо чатыры гродзенскія санаторыі могуць прымаць бязвізавых турыстаў. Да «Жамчужыны» і «Нёман-72» далучыліся «Парэчча» і «Азёрны». Кожны з іх прапануе дзясяткі аздараўленчых працэдур. Для бязвізавых гасцей тут гатовы скласці гібкі комплекс рэабілітацыі да 10 дзён.**

Папярэдні ўказ па 5-дзённым бязвізавым рэжыме хоць і закранаў дзве гродзенскія здраўніцы, але скарыстацца іх паслугамі за такі кароткі тэрмін замежныя турысты не паспявалі. Часу хапала толькі на тое, каб агледзець мясцовыя славутасці. Новы ўказ, які дзейнічае з гэтага года, пашырыў рамкі побыту да 10 сутак. Цяпер бязвізавыя турысты маюць магчымасць атрымаць паўнавартасны курс медыцынскай рэабілітацыі.

— Раней нашы бязвізавыя санаторыі аказвалі толькі гасцінічныя паслугі — размяшчалі гасцей на начлег, кармілі сняданкам ці вячэрай. Цяпер тэрмін побыту павялічыўся ўдвая.Ужо можна прапанаваць аздараўленчыя працэдуры, хаця звычайна наш медыцынскі курс разлічаны на 14 дзён. І мы ўносілі прапановы менавіта на гэты тэрмін. Тым не менш, нашы санаторыі распрацоўваюць праграмы згодна з новым указам, — паведаміў **начальнік абласнога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Анатоль ГАНЧАР.**

Сёлета ў бязвізавую зону трапіў шматпрофільны санаторый «Парэчча», які размясціўся ў маляўнічым сасновым бары каля возера. Тут можна прайсці курс лячэння захворванняў органаў дыхання, стрававання, абмену рэчываў, дыябету і іншых хвароб. Распрацавана праграма па зніжэнні вагі. У хуткім часе пачне аказваць паслугі цэнтр прыгажосці. На аднаўленне лячэбнай базы летась выдаткавана 700 тысяч рублёў. Санаторый вядомы сваёй мінеральнай вадой, якая здабываецца з мясцовай свідравіны, а па складзе адпавядае славутым крыніцам літоўскага курорта Друскенікі, які, дарэчы, знаходзіцца ўсяго за 18 км ад Парэчча. Шырока выкарыстоўваецца і знакамітая гаюча сапрапелевая гразь. Для бязвізавых турыстаў гатовы скласці індывідуальны комплекс рэабілітацыі, адзначыла **намеснік дырэктара Тацццяна АЦКЕВІЧ.**

Каля ста медыцынскіх працэдур — у арсенале адной з самых вядомых у рэгіёне здраўніц — санаторыя «Азёрны». **Менеджар па турызме Міхаіл КАЖУРА** расказаў, што нядаўна тут прымалі бязвізавых турыстаў. Адзін з іх — уладальнік турыстычнай фірмы з Літвы — спецыяльна прыехаў, каб пазнаёміцца з беларускай санаторнай базай, і збіраецца прапанаваць сваім кліентам адпачываць менавіта тут. Пра намер прыехаць на аздараўленне заявілі бязвізавыя турысты з Германіі.

— Хаця санаторый толькі з гэтага года ўвайшоў у бязвізавую зону, у нас напрацаваны багаты вопыт работы з замежнымі турыстамі, якія прыязджаюць з Польшчы, Літвы, Расіі. Мы адышлі ад класічнага пакета на 14 дзён і гатовы прапанаваць скарочаны варыянт. Турысты з Германіі ўжо забраніравалі нумары на 10 дзён.

Важным звяном у ланцужку «турыст — санаторый» з'яўляецца турыстычная фірма, якая будзе накіроўваць замежных грамадзян без віз на лячэнне і аздараўленне. У Гродне ўжо больш за 20 турфірм атрымалі сертыфікаты на гэты від дзейнасці. Тураператары зацікаўлены ў пасрэдніцкіх паслугах, яны актыўна заключаюць дагаворы з санаторыямі бязвізавай зоны.

— Мы можам самі зарэгістравацца і прайсці сертыфікацыю як туратэратары, але дагавор з турыстычнымі фірмамі ўсё роўна абавязковы, — зазначыў Анатоль Ганчар. — Да таго ж кошт нашых пуцёвак не будзе меншы, чым праз турфірму. Дарэчы, кошт для ўсіх кліентаў — і беларусаў, і замежных гасцей — павінен быць аднолькавы.

Па спектры і якасці паслуг беларускія санаторыі не саступаюць еўрапейскім, лічаць прадстаўнікі санаторна-курортнага лячэння. Аздараўленчая база штогод папаўняецца і аднаўляецца. Так, летась на гэтыя мэты ў вобласці затрачана 10,5 млн рублёў. Амаль усе сродкі — з уласных фондаў. І гэта дае добры вынік. Папулярнасць аздараўленчага турызму расце і складае значную частку даходу бюджэту. Дастаткова толькі прывесці такую лічбу: на долю санаторыяў прыпадае 70% усяго экспарту турыстычных паслуг.

— Мы гатовы прыняць бязвізавых турыстаў ва ўсіх санаторыях Гродзенскай вобласці, — адзначыў Анатоль Ганчар. — Іх у нас 10, і яны маглі б стаць свайго роду свабоднай зонай для гасцей «бязвіз». Спадзяюся, што будзем рухацца ў гэтым напрамку, бо ён выгадны для краіны.

❍ **У тэму**

Днямі першых бязвізавых турыстаў прыняў Гродзенскі аэрапорт. Госці з дзелавым візітам прыляцелі з Польшчы. Згодна з Указам № 462, транспартны калідор у бязвізавую зону з гэтага года пашырыўся. Да аўтамабільных пунктаў пропуску далучыліся чыгунка і авіяцыя. Больш за 20 бязвізавых турыстаў прыехалі на цягніку, а ўсяго з пачатку года Гродна і Гродзенскі раён наведалі звыш 700 замежных грамадзян, пераважна з Літвы і Польшчы. Таксама сярод бязвізавых турыстаў ёсць жыхары Францыі, Італіі, Фінляндыі, Германіі і іншых краін.

**НАША ДАВЕДКА**

За мінулы год у 10 санаторыях Гродзенскай вобласці аздараваліся і адпачылі больш за 65 тыс. чалавек, з іх 32 % — замежныя грамадзяне. Яны пакінулі ў нашых санаторыях каля 24 млн рублёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by* ■

■ Фестываль

# НАТХНЁНЫЯ «НЯБЁСАМІ»

## У Мінску прайшоў IV Фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»

**Батлеечнікі і лялечнікі сабраліся на святкі ў адукацыйным цэнтры Свята-Елісавецінскага манастыра ўжо чацвёрты раз. Аб'яднаныя шчырым жаданнем падарыць гледачам радасць і святочны настрой, яны прывезлі ў Мінск займальныя і павучальныя, вясёлыя і кранальныя, класічныя і эксперыментальныя, непадобныя адзін да аднаго спектаклі.**

Пад адным дахам сёлета сустрэліся калектывы з розных гарадоў Беларусі, Украіны, Расіі, Літвы, Эстоніі, Вялікабрытаніі і Германіі. Беларускую і замежную праграмы «Нябёсаў» ацэньвалі не толькі гледачы, але і члены журы: амаль усе тэатры-ўдзельнікі ў выніку былі адзначаны дыпломамі, у прыватнасці спецыяльнымі дыпломамі ад Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Пераможцам стаў львоўскі тэатр эстрадных мініяцюр «І людзі, і лялькі»: пастаноўка «Скінія залатая» Рамана Козака атрымала Гран-пры і дыплом «За найлепшы спектакль».





Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.



Пасля падзякі арганізатарам прадстаўнікі тэатра ў калядных традыцыях выканалі вядомую песню, словы якой адразу падхапілі іншыя канкурсанты.

Самым далёкім ад Беларусі ўдзельнікам «Нябёсаў» гэтым разам быў лялечны тэатрык «Вялікі Нос» (*BigNose Theatrik*) з англійскага горада Олд Стратфард. Ён прыехаў на фестываль у Мінск упершыню і атрымаў дыплом «За найлепшы дэбют» — яго спектакль «Казка пра БабУшку» рэжысёра Наталлі Курашовай-Шрадзецкі паказалі ажно два разы. Самай кранальнай ды павучальнай назвалі пастаноўку «Мішка і Раство» ад тэатрыка Сашы Луняковай з расійскага горада Пушкіна: ёй прысудзілі дыплом «За найлепшае раскрыццё духоўна-маральнага зместу спектакля». Прыгожая батлейка сямейнага тэатра з беларускай вёскі Стойлы павезла дадому ўзнагароду «За найлепшае мастацкае афармленне батлеечнай скрыні». На «Нябёсах», дарэчы, была арганізавана адмысловая выстаўка ўзораў батлеечнага мастацтва — макеты лялек ды скрыняў прадаставілі самі ўдзельнікі.

Вядучы і мастацкі кіраўнік фестывалю акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага Аляксандр Ждановіч нагадаў, што фестываль не імкнецца вызначаць найлепшых, а хоча падарыць радасць і любоў кожнаму, хто са сваім тэатрам прыехаў у Свята-Елісавецінскі манастыр. Здаецца, гледачам і членам журы сапраўды спадабаліся ўсе выступоўцы, і ніводнаму чалавеку на «Нябёсах» не прыйшлося адчуць сябе пакрыўджаным.

Фестываль батлеечных і лялечных тэатраў у Мінску можна лічыць і сапраўдным дзіцячым святам: амаль кожны калектыў, акрамя спектакляў, што ўдзельнічалі ў конкурснай праграме, падрыхтаваў забаўляльную праграму для маленькай аўдыторыі. Некаторыя спектаклі, як «Вар'етэ з маленькім Генры» берлінскага тэатра «Thomas Herfort Marionettes», сумяшчалі дзею з інтэрактывам: некаторыя дзеці нават заплакалі ад таго, што не дачакаліся сваёй чаргі пагуляць з лялькамі.

Як звычайна, удзельнікі «Нябёсаў» сёлета наведалі бальніцы і інтэрнаты ў межах дабрачыннай акцыі «Святло душы — дабрадзейнасць». На самім жа фестывалі кожны ахвотны, апроч уласна прагляду батлейкі, мог узяць удзел у майстар-класах па маляванні, саломапляценні і майстраванні лялек хоць з драўляных прышчэпак, хоць са старой адзежы (у руках здатнага лялечніка нічога не прападае).

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Сфера

# ШТО ЗАСТАНЕЦЦА АД ПРАЕКТА «КУЛЬТУРА І КРЭАТЫЎНАСЦЬ»

## Кнігі, анлайн-курсы і Абсерваторыя

**Ужо ў гэтым месяцы да завяршэння падыходзіць праграма «Культура і крэатыўнасць», якая на працягу двух гадоў функцыянавала ў шасці краінах Усходняга партнёрства — Грузіі, Украіне, Малдове, Арменіі, Азербайджане і ў тым ліку, канешне, у Беларусі. Гэта праект, які развіваў тэму культурнай і крэатыўнай індустрый і садзейнічаў іх развіццю, ствараў умовы для адукацыі культурных менеджараў і паказваў ім магчымасці міжнароднага супрацоўніцтва, які нарэшце за два гады сваёй дзейнасці павялічыў прысутнасць культурнай дыскусіі ў краінах Усходняга партнёрства на дваццаць працэнтаў. Працэс кажучы, праект развіваў культуру, і пэўныя дасягненні ў гэтай сферы на яго рахунку сапраўды ёсць.**

На сёння праект Еўрапейскага саюза і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць» у шасці краінах арганізаваў 252 мерапрыемствы, яго сайт наведала паўмільёна чалавек, старонка праграмы ў «Фэйсбуку» налічвае трыццаць тысяч падпісчыкаў. Ён ахапіў настолькі шырокае кола зацікаўленых, што на нефармальнае падвядзенне вынікаў дзеяння праграмы ў Беларусі, якое адбылося 18 студзеня на пляцоўцы Прэс-клуба, прыйшлі не толькі менеджары, але і мастакі, журналісты, прадстаўнікі IT-сферы, фэшн-індустрыі, сферы адукацыі і так далей.

Большасць з іх былі непасрэдна датычныя да праекта ў два гады яго працы: праграма пачала рэалізоўвацца ў канцы 2015 года і за гэты час паспела ў розных варыяцыях ахапіць вялікую колькасць пытанняў, на якія не заўсёды звяртаюць увагу тыя інстытуцыі, што за сферу культуры адказваюць па азначэнні: уклад культурнай і крэатыўнай індустрый у эканамічнае і сацыяльнае развіццё краіны, супрацоўніцтва паміж грамадскімі і прыватнымі арганізацыямі, роля грамадства ў фарміраванні культурнай палітыкі, удзел краін Усходняга партнёрства ў еўрапейскіх праграмах ды іншае.

**На сайце праекта на васьмі мовах даступныя чатырнаццаць анлайн-курсаў, якія могуць аказацца карыснымі на розных этапах развіцця ўласных праектаў і арганізацый.**

Дарэчы, праграма «Культура і крэатыўнасць» рэалізоўвалася праз офіс Брытанскага савета, але з той нагоды, што ў Беларусі яго няма, праектам займаліся фрылансеры-менеджары (Малдове, дарэчы, таксама прыйшлося шукаць выйсце з аналагічнай сітуацыі). Каардынатар у Беларусі Аліна Дзеравянка назвала гэта адной са спецыфічных якасцяў работы праекта ў нашай краіне. «Не паўсюль праграма праходзіла раўнамерна, хоць задумвалася яна аднолькавай для шасці краін, — кажа Аліна Дзеравянка. — Але нягледзячы на тое, што Еўрапейскі саюз бачыць нас як рэгіён, відавочна, што мы развіваемся па-рознаму, у кожнага свае прыярытэты і стратэгіі».

Адным з дасягненняў праграмы «Культура і крэатыўнасць» можна лічыць шэсць нацыянальных канферэнцый, арганізаваных у розных краінах. У Беларусі яна была прысвечана супрацоўніцтву IT-сферы і культуры (кожная краіна выбірала тэму адпаведна парадку дня) і, магчыма, сваё існаванне працягне.

У шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё культурных менеджараў, прынялі ўдзел 262 чалавекі з шасці краін. Дарэчы, некаторыя ідэі праекта датычыліся і культурнай журналістыкі.

Важным кампанентам дзейнасці «Культуры і крэатыўнасці» сталі даследаванні (некаторыя даступныя на сайце праекта culturepartnership.eu), якія між іншым дазволілі выявіць у культурнай сферы Беларусі выдатны чалавечы патэнцыял і актыўнае развіццё культурнай інфраструктуры, у што лёгка паверыць, гледзячы, як актыўна апошнім часам у нас з'яўляюцца новыя прасторы і адпаведна новыя гульцы сферы. І ў той жа час заўважылі, што паняцце крэатыўнай індустрыі ў беларускае заканадаўства ніяк не інтэгравана, хоць нам неабходна спрашчаць умовы для міжнароднага супрацоўніцтва і доступ да фінансавання і падтрымкі.

Каб пакінуць спадчыну, у рамках «Культуры і крэатыўнасці» пераклалі дзве кнігі — дапаможнік «Настольная кніга па праектаванні культурных цэнтраў» венгерскага даследчыка Петэра Ленія, а таксама «Футболкі і касцюмы: гід па крэатыўным бізнесе» Дэвіда Пэрыша. Абедзве кнігі цяпер можна прачытаць на беларускай мове.

**Важным кампанентам дзейнасці «Культуры і крэатыўнасці» сталі даследаванні, якія між іншым дазволілі выявіць у культурнай сферы Беларусі выдатны чалавечы патэнцыял і актыўнае развіццё культурнай інфраструктуры.**

Апроч гэтага на сайце праекта на васьмі мовах даступныя чатырнаццаць анлайн-курсаў, якія могуць аказацца карыснымі на розных этапах развіцця ўласных праектаў і арганізацый.

Нарэшце, яшчэ адной рэччу, што застанецца пасля заканчэння праекта, з'яўляецца Культурная абсерваторыя краін Усходняга партнёрства, якая хутка павінна стаць некамерцыйнай арганізацыяй. Гэта вялікі даследчы праект — ім займаюцца эксперты з сямі краін, — які акажа экспертную падтрымку крэатыўным індустрыям ва ўсіх шасці краінах і будзе накіраваны на тое, каб рашэнні, што прымаюцца ў галіне культуры, былі больш разумныя і абгрунтаваныя.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Кінакрокі

# Аляксандра БУТАР: «У КІНО МЯНЕ ЎЖО НІЧОГА НЕ ЗДЗІЎЛЯЕ»

**Рэжысёр Аляксандра Бутар вядома нам як аўтар знятых на «Беларусьфільме» карцін «Белыя росы. Вяртанне» і «Салодкае развітанне Веры»; як стваральнік творчай майстэрні «Тэрыторыя кіно», дзе арганізуюцца курсы рэжысёраў і акцёраў; як удзельнік дыскусіі пра сучаснае незалежнае кіно, што адстойвае «прафесію». 1 лютага ў пракат выходзіць трэці поўнаметражны і першы незалежны ад дзяржаўных грошай фільм Аляксандры — «У асабістую прастору ўваход забаронены». Карціна распавядае пра перфекцыяніста-праграміста Макса, які пакутуе з-за нязначнай недасканаласці ў зробленай працы. У пэўны момант ён сустракае сваю супрацьлегласць Машу, і гэта сустрэча мяняе яго жыццё. Перад прэм'ерай фільма, якая адбудзецца 22 студзеня ў кінатэатры «Масква», мы пагутарылі з Аляксандрай Бутар і закранулі тэмы новага фільма, «Тэрыторыі кіно» і нашага сучаснага незалежнага.**



***— Дзве вашы папярэднія карціны былі зняты на «Беларусьфільме». Як вы здолелі знайсці грошы на незалежны праект?***

— Усё аказалася не так складана, як я думала. У нас не было часу шукаць спонсарскія грошы, таму што мы вельмі хутка прыдумалі ідэю, і я нават не заўважыла, як узо зняла фільм. Я проста звярнулася да сяброў, у якіх ёсць свае кампаніі і каму гэта магло быць цікава. Такім чынам, нас атрымалася чацвёра партнёраў. Гэта музычны гурт «Тяни-Толкай», унёсак якога ў фільм велізарны, таму што на яго лягла ўся гукавая частка, да таго ж кампазітарам фільма стаў іх гукарэжысёр Аляксандр Каляда. Сьвяточнае агенцтва «Арт-Апетыт» дапамагло нам з касцюмамі, якія проста так мы б не змаглі арандаваць. Трэці партнёр — літоўскае прадзюсарскае агенцтва «Baltic Open», яно зараз займаецца прасоўваннем фільма на прыбалтыйскай тэрыторыі, у нас ужо ёсць дамоўленасць аб пракаце ў Вільнюсе і Клайпедзе. Чацвёртым партнёрам — і вытворчай кампаніяй — з'яўляецца творчая майстэрня «Тэрыторыя кіно», якую я стварала як месца, дзе апроч навучання дзяцей можна вырасціць каманду для ўласнай кінавытворчасці. Так яно і атрымалася, проста я не думала, што зноў стану здымаць так хутка.

**«Калі ты выходзіш у рэальную вытворчасць, палову таго, што ты прыдумаў, «з'ядае» дрэнная арганізацыя. А калі ты сам усё арганізуеш, самога сябе падвесці не можаш».**

***— То-бок, галоўным у гэтай справе аказалася дружба.***

— Так, але яшчэ працуе імя. Напрыклад, мне было лёгка дамовіцца з пракатчыкамі, хоць я думала, што ўзнікнуць цяжкасці, таму што мой фільм — незалежны, у яго няма статусу, перад якім адкрываюцца дзверы. Але мяне ўсе, як аказалася, помняць, нават у Літве, таму мне было лягчэй.

***— Мяне крыху бянтэжыць, што фільм вы зрабілі так хутка: сцэнарый напісалі за месяц, здымкі цягнуліся дзесяць дзён, скора карціна выходзіць у пракат. Мне гэта нагадвае паточную вытворчасць «Беларусьфільма».***

— На «Беларусьфільме» стварэнне фільма цягнецца год, там за такія тэрміны не здымаюць. У любой кінавытворчасці самы дарагі перыяд — здымачны, а ў нас усё было добра сплanavana, сцэны састыкаваны так, каб паспець зняць у тэрмін. Да таго ж папярэдне мы з акцёрамі ў аўдыторыі адрэпеціравалі фільм, ножкамі прайшлі кожную сцэну, усё разабралі. Таму справа ў планаванні, а не ў тым, што ў мяне не было часу здымаць.

***— Вы напісалі сцэнарый...***

— Гэта была мая ідэя, а мой пастаянны суаўтар Юля Гірэль, як заўсёды, яе падхапіла. Мы добра працуем у пары, таму што калі ты супрацоўнічаеш з чалавекам, які не проста цябе разумее, але і размаўляе з табой на адным прафесійным узроўні, усё атрымліваецца лёгка і хутка.

***— Наколькі я зразумела з вашых інтэрв'ю і відэа, вы таксама апалагет ідэі, што кіно не павінна быць нудным. З пункту гледжання сцэнарыста і рэжысёра скажыце, чым ваш фільм павінен зачапіць гледача?***

— Я так казала — нудным? Не, я ўвесь час кажу слова «прафесія», проста шмат хто мяне няправільна разумее. Няма такога — нудны альбо не нудны фільм: ён альбо прафесійны, то-бок хораша зроблены, альбо проста бяздарны, таму і нудны. Я бяру на сябе адказнасць гэта сцвярджаць, таму што нешта разумею ў прафесіі рэжысёра, паколькі займаюся ёй усё жыццё і ўсё жыццё вывучаю. Фільм «У асабістую прастору ўваход забаронены» зроблены прафесійна, гэта не аматарскае кіно. Па жанры — вельмі лёгкая рамантычная камедыя, настолькі лёгкая, што нават празрыстая. Ты глядзіш яе з усмешкай, недзе плачаш. Яна разлічана на падлеткаў і моладзь, хоць ёсць тут і старэйшыя персанажы. Просты і чысты фільм, без прэтэнзій на фестывальнае кіно, як у нашых незалежных карцін, быццам разлічаных на інтэлектуальнага гледача. Я гэта вельмі не люблю, таму што такім чынам часта прыкрываецца слабая рэжысура. Маўляў, калі фільм вы не зразумелі, то ён не для вас, а для іншага гледача. Насамрэч няма паняцця «фестывальнае кіно»: альбо кіно, альбо не кіно.

***— Праскочыла, што ў сваёй кінашколе вы падрыхтавалі для сябе каманду. Вашы навучэнцы працавалі на здымачнай пляцоўцы новай карціны?***

— Так, адну з галоўных роляў выканаў наш таленавіты студэнт Сцяпан Ляткоўскі, які, я спадзяюся, працягне сваю адукацыю ў тэатральнай ВНУ. Яго партнёрша па фільме — таксама наша дзяўчына Каця Самойла. Астатнія працавалі ў здымачнай групе, пісалі гук, былі асістэнтамі. Для іх гэта быў кайф, а не абавязалаўка. На «Беларусьфільме» я адчула, што кінастудыя — гэта завод, куды ўсе проста ходзяць на працу з дзевяці да пяці, а фільм патрэбен толькі табе і максімум — аператару і акцёрам. А ў нашай маленькай кампаніі ўсе «гараць» справай, нехта, магчыма, нават больш за мяне.

***— Вы ўпершыню выступілі ў якасці прадзюсара, гэта рэжысуры не перашкодзіла?***

— Наадварот, дапамагло. Заўсёды было шкада, калі я задумала шыкоўную сцэну, а яна церпіць з-за дрэннай арганізацыі. Наш майстар у Акадэміі мастацтваў Аляксандр Яфрэмаў казаў: "Я скончыў сцэнарый фільма і падумаў, як было б класна яго не здымаць». Бо калі ты выходзіш у рэальную вытворчасць, палову таго, што ты прыдумаў, «з'ядае» дрэнная арганізацыя. А калі ты сам усё арганізуеш, самога сябе падвесці не можаш.

У вялікай дзяржаўнай кінавытворчасці шмат людзей, імі складана кіраваць, і стаўленне да кіно ў іх іншае. Я рабіла два вялікія праекты на тэлебачанні, дзе тое ж самае: арганізацыя церпіць менавіта з-за аб'ёмаў — шмат людзей, грошай. А тут усё было пад маім кантролем, і гэта было класна, хоць і цяжка.



На здымках фільма «У асабістую прастору ўваход забаронены».

***— Што яшчэ ў дзяржаўнай кінавытворчасці перашкаджае рэалізоўваць ідэі?***

— Праблема ў тым, што на «Беларусьфільме» няма добрых сцэнарыяў. Мне і цяпер нешта дасылаюць — гэта нават горш, чым калі я пачынала там працаваць. Тады таксама не было сцэнарыяў, але хоць нешта можна было перапісаць, а тое, што я чытала зараз, — дрэнна. У краіне няма сцэнарыстаў, проста няма. Але мяне іншае непакоіць: рэдактары і мастацкія кіраўнікі, якія павінны разумець, як можна выправіць сцэнарыі, у якіх ёсць хоць нейкія задаткі будучага фільма, гэтага не робяць. У мяне складваецца ўражанне, што ніхто не разбіраецца ў драматургіі, для мяне загадка, чаму такія рэчы ідуць у работу.

***— Вам прапанавалі нешта зняць на «Беларусьфільме»?***

— Так, я вельмі здзівілася, таму што на кінастудыі павінны не вельмі мяне любіць. Ім было цяжка са мной: я была патрабавальная, капрызная, я ім надакучыла. А праз некаторы час з'яўляецца такая прапанова, якую я не ведаю, як растлумачыць... Я пакуль туды не іду. Шчыра кажучы, няма калі, у мяне цудоўна развіваецца свая справа, лепш я на яе патрачу свае сілы, нервы і час. Толькі калі б мне даслалі сапраўды класны сцэнарый, напэўна, стала б разважаць далей.

**«Звычайна я ведаю, чым фільм скончыцца, але калі ён класна зроблены, усё роўна цікава, як таленавіта людзі прымяняюць сваё майстэрства».**

***— Апошнім часам ішла дыскусія пра наша незалежнае ігравое кіно, у якой вы таксама ўдзельнічалі.***

— Мая балючая тэма, яна мне ўжо надакучыла. У нас дзве крайнасці: ёсць «Беларусьфільм» з велізарнымі бюджэтамі, дзяржаўнай падтрымкай і дрэннымі фільмамі, а ёсць незалежныя дзеці з такімі ж дрэннымі фільмамі. Я спрабавала размаўляць з гэтымі маладымі рэжысёрамі, але дыскусія не атрымалася, неадэкват поўны. У Нацыянальным конкурсе кінафестывалю «Лістапад» мне адно спадабаўся фільм Дзімы Дзядка «Сумленны погляд». Мы з Дзімам пазнаёміліся, я запрасіла яго ў кінашколу да студэнтаў. Бачна адразу: які фільм, такі і чалавек — нармальны, інтэлігентны, культурны хлопец. Талент — ён ва ўсім. Альбо Міця Сямёнаў-Алейнікаў: калі я ўбачыла яго работу «Адной крыві», падумала, што гэта суперпрафесійнае кіно. Калі пачынаеш размаўляць з Міцем, слухаеш яго разважанні аб прафесіі — ва ўсім відаць высокі ўзровень. А калі я бачу пустэчу на экране, не здзіўляюся, калі выходзіць настолькі ж пусты чалавек. Спачатку мяне гэта раздражняла, а потым стала нудна, і я перастала рэагаваць. І ведаеце, што самае цікавае: з любога фільма, што я бачыла ў Нацыянальным конкурсе «Лістапада», можна зрабіць класнае кіно, калі падысці да яго больш прафесійна.

***— Чаму, на вашу думку, у нашым незалежным ігравым кіно, як вы кажаце, няма прафесіі?***

— Таму што аўтары не хочуць развівацца. Калі трапілі на «Лістапад» — думаюць, што яны супер, хоць гэта звычайны фестываль. Кінафестываляў у свеце — мора, але яны нічога не значаць, значаць толькі касавыя зборы, поўныя залы і прызнанне гледача. Часта рэжысёр з ліку нашых незалежных не можа растлумачыць, пра што яго фільм. Як ты здымаеш фільм, калі не разумееш, пра што ён? Адсюль дзіцячыя выказванні, маўляў, калі вы пагляздзелі і нічога не зразумелі, гэта вашы праблемы. Сваім студэнтам я ў першую чаргу кажу, што рэжысуры немагчыма навучыцца, усё жыццё прыйдзецца толькі папаўняць багаж, бо нават за тыдзень ты можаш стаць зусім іншым. У свой час мы з Юляй напісалі сцэнарый фільма «Салодкае развітанне Веры» і падалі яго на конкурс кінапраектаў Міністэрства культуры. Ён прайшоў конкурс, але мне прапанавалі адкласці «Веру» і найперш зняць працяг «Белых росаў». Калі нарэшце прыйшоў час запуску «Веры», я адкрыла сцэнарый, што ляжаў цэлы год, і ледзь не памерла. Я кажу: «Юля, як мы маглі напісаць такую лухту і як яе прапусціла міністэрства?» А фільм запушчаны, яго трэба здымаць — мы за некалькі тыдняў поўнасцю перапісалі сцэнарый. Ніхто ў выніку не заўважыў, хоць у фільме няма ніводнага слова з таго варыянта, які прайшоў конкурс. Так само жыццё ўстроена: ты не можаш заставацца тым, кім быў год таму.

***Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by***

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

*katsyalovich@zviazda.by*

# Бачыш? Зорка ўпала!

## ШТО ДУМАЛІ НАШЫ ПРОДКІ, ГЛЕДЗЯЧЫ НА НАЧНОЕ НЕБА?

**«Аднойчы зімовым вечарам сустрэліся тры каралі на небасхіле...» Так магла пачынацца адна з казак, якую расказвала маці сваім дзеткам на беларускай зямлі некалькі стагоддзяў таму. Тры Каралі — гэта, як мы называем сёння, пояс Арыёна. Ён вельмі добра бачны зараз увечары. Настолькі яркі, што нават у засвечаным ліхтарамі горадзе яго даволі лёгка знайсці. Калі зазірнуць у планетарый, там раскажуць, што Арыён — гэта паляўнічы, які прыйшоў да нас з старажытнагрэчаскіх міфаў. А вось каб даведацца, адкуль узяліся Тры Каралі і якія іншыя назвы атрымалі вядомыя сузор'і ў народных беларускіх легендах, мы звярнуліся да Цімафея АВІЛІНА, навуковага супрацоўніка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**



### Калі цмок золата нясе

У сваіх даследаваннях Цімафей займаецца этнаастраноміяй. Гэта навука, якая вывучае, як тыя ці іншыя нябесныя целы і з'явы адбіваліся на культуры, у тым ліку вызначае, адкуль пайшлі іх назвы. Нашы продкі даволі часта бачылі ў працэсах, якія не маглі растлумачыць нейкі невядомы ім знак. Напрыклад, дзяўчаты выходзілі на Багатую куццю (вечар напярэдадні старога Новага года) паваражыць на каханага і гаварылі: «Гэта — твая зорка, а гэта — мая». Далей чакалі, пакуль зорка скоціцца, і на які бок сяла яна такім чынам пакажа — адтуль і жаніх прыйдзе. На Куццю, перад Калядамі, глядзелі на неба і думалі: калі шмат зорак, улетку будзе шмат грыбоў і ягад.

Вядома, старажытныя павер'і сталі асновай для многіх сучасных прыкмет. Калі ляціць метэор, цяпер мы глядзім на гэту «лятучую зорку» і загадваем жаданне. Такое павер'е пайшло ад таго, што зорка атаясамлівалася з душой. У першую чаргу лічылася, што, калі яна падае, — гэта хтосьці нараджаецца або памірае. Казалі: калі зорка хутка ляціць, дык і роды хуткімі будуць. Яркая або цьмяная — такі і чалавек будзе. Менавіта таму найбольш яркія зоркі, такія як, напрыклад, Венера, маглі параўноўваць з царом і гаварылі: «Царова зорка ўзышла». Цьмяную ж атаясамлівалі з ведзьмай або хворым. Тыкаць пальцамі ў зоркі нельга — можна так наткнуцца на сваю і скінуць з неба. Таксама лічылі, што з-за гэтага можа барадаўка на пальцы з'явіцца. Пры гэтым лячылі яе гэтым жа спосабам: калі ляцела зорка, трэслі рукой — барадаўку быццам скідвалі.

Асабліва яркія метэоры, іх цяпер называюць балідамі, параўноўвалі з цмокамі. У залежнасці ад таго, якога ён колеру, казалі, што цмок нясе золата або срэбра. У некаторых месцах так называлі д'ябла, які ператвараўся ў змяю. Таму адпаведна і людзі раней маглі на балід проста казаць: «Змей паляцеў». А яшчэ ў метэор ператвараецца ведзьма ці чараўнік, каб што-небудзь скрасці.

Традыцыя ж загадваць жаданне на зоркі, якія падаюць, звязана з верай у тое, што знічка — гэта анёл, які спускаецца на зямлю па душу чалавека, які адыходзіць у іншы свет. І нібыта, пакуль ён ляціць па небе, ён не можа нікому адмовіць. Таму, атрымліваецца, чалавек са сваімі жаданнямі звяртаецца непасрэдна да анёла. Але метэор меў і канкрэтнае практычнае прымяненне: калі яго бачылі, адцягвалі валасы — які хвост у зоркі, настолькі доўгія і валасы будуць.

Таксама дзе-нідзе верылі, што калі зорка ўпадзе на зямлю, то на тым месцы разальецца смала і нельга будзе будаваць дом. Такое меркаванне часцей сустракаецца ва ўкраінскіх вераваннях. Там лічылі, што чорт гуляе па небе і спрабуе падмяніць зоркі на свае свечкі, а анёл скідвае іх. Знічка — гэта падае сам чорт або яго свечка, таму і разліваецца смалой, далятаючы да зямлі. Акрамя таго, сцягваць зоркі з неба маглі ведзьмы, выкарыстоўваючы пры гэтым звычайную нітку. Ім гэтыя нябесныя целы былі патрэбны для павялічэння магічнай сілы.



Мастачка Алёна Сяргеева адлюстравала вобраз Птушынай дарогі.

### Як не пакрыўдзіць Месяц

Назвы сузор'яў таксама былі звязаны з легендамі, многія з якіх хрысціянізаваныя. Напрыклад, Вялікую Мядзведзіцу часта называлі Ільёў Воз: святы Ілья быў занесены на неба жывым у агністай калясніцы. Тым часам у літоўцаў захавалася такая назва, якая азначае Воз Перуна. У такім разе можна рэканструяваць, што асноўны вобраз калісьці раней мог быць звязаны не са святым, а з паганскім богам Перуном. У немцаў назва гэтага сузор'я гучыць як Воз Одзіна. Апісвалі яго так: воз і тры кані. Адам Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш» піша пра Мядзведзіцу як пра Давыдаў Воз і кажа, што старыя літвіны называлі яго Возам злых духаў», таму што «На ім Люцыпар, калі Бога не паслухаў, / Дык млечным шляхам рваўся ўжо ў нябёс парогі, / Ды Міхаіл спыніў яго і збіў з дарогі, / І воз той паміж зор зламаны кавыляе — / Міхал-Архангел напраўляць не дазваляе».

Другая зорка ад канца ручкі каўша Вялікай Мядзведзіцы называецца Міцар, побач з ім — Алькор. Лічылася, асабліва ва ўкраінскіх вераваннях, што Алькор — гэта сабака, які прывязаны да Міцара. І, калі ён перагрызе вяроўку, будзе канец свету. Такі матыў сустракаецца і ў іншых міфалогіях. А ў палякаў Алькор называюць Фурманам. У эстонцаў выкарыстаны іншы вобраз: нібыта воўк хацеў з'есці ўсіх валоў, але пастух яго заўважыў і прывязаў вяроўкай да суседняй зоркі. Яшчэ ёсць павер'е, што адна з зорак Вялікай Мядзведзіцы з'яўляецца ў некаторых мясцінах, і, дзе яна спыніцца на Купалле, людзі будуць шчаслівыя.

Пояс Арыёна ў Беларусі называлі «Тры Сястры», або «Тры Пралі». Гэта нагадвае вядомы казачны матыў, калі тры дзяўчыны прадуць жыццё чалавека. Назвы Тры Каралі, або Тры Вешчуны, звязаны з адным з асноўных хрысціянскіх сюжэтаў — нараджэннем Хрыста. Таксама ўзыход сузор'я сімвалізаваў пачатак свята Вадохрышча.

А зорку, якую бачылі на Калядзы, называлі Бэтлеемскай. Прычым гэта магла быць і планета.

Гэтае ж сузор'е называлі Каромысел — тлумачылі тым, што быццам гэта дзяўчына нясе ваду. Гісторыя гучыць так: аднойчы дзяўчына ў поўню пайшла па ваду, у калодзежы набрала вады, і штосьці ёй не спадабалася — была ў кепскім настроі — паказала яна азадак Месяцу. Ён пакрыўдзіўся і зацягнуў яе на неба. Гэта легенда — наказ людзям паважаць нябесныя целы, бо калісьці яны былі звязаны з рэлігійнымі ўяўленнямі, багамі і духамі. Напрыклад, у каталікоў ёсць вобраз Маці Божай, якая сядзіць на паўмесяцы. І часта яркая зорка, намаляваная побач з паўмесяцам, і сімвалізуе яе.

Дарэчы, пра плямы на Месяцы ёсць некалькі крывавых гісторый. Казалі, што гэта Каін закалоў Авеля, ці гэта плямы ад крыві з крыжа, на якім Хрыстос быў распяты, ці гэта святы Юрый забівае змея. Нават гавораць, што гэта Адам забівае Еву. Але ёсць і іншае ўяўленне: гэта твар самога Месяца. А змену яго фаз тлумачылі так: у Перуна была жонка Заранка, і яна пачала сустракацца з Месяцам. Перуну, вядома, гэта не спадабалася, і ён яго рассек. Але Бог зрабіў так, каб ён кожны раз перараджаўся. Яшчэ адна легенда гаворыць: на небе ёсць баба, якая кожны раз замешвае цеста, і з яго з'яўляецца месяц нібыта блін. Але потым ён крышыцца на зоркі і зноў падае ў гэтую адзежку. Пад вёскай Сцеберакі (Вілейскі раён) знайшлі шэраг камянёў, на кожным з якіх малюнкі нібы рагоў, але трошкі павернутыя. Лічыцца, што такім чынам людзі спрабавалі адлюстраваць змену фаз Месяца. На возеры Янава, недалёка ад Полацка, ёсць каменны комплекс, які называюць беларускім Стоўнхенджам. Даследчыкі спрабуюць звязаць яго зназіраннямі зорнага неба.



Той самы Змей, якога забіў святы Юрый, вачамі бельгійскага мастака.

### Сказ пра квактуху

Плеяды — зорны збор у сузор'і Цяльца — называлі проста Сіта і тлумачылі, што праз яго Бог прасеяў першыя зярняткі жыта, калі толькі сусвет зачынаўся. Ёсць цэлы шэраг назваў Плеяд, як Валасажар, Вісажар, Валосыня. Дакладная этымалогія незразумелая, але, магчыма, назвы звязаны з культам Вялеса (другі па значнасці бог пасля Перуна). Ёсць народная этымалогія, якая гаворыць, што Валасажар — гэта яркія валасы. Яшчэ адна з магчымых інтэрпрэтацый: так раней маглі называць пэўны від прычоскі ў замужніх жанчын. Па ўзыходзе ці заходзе Плеяд адзначалі пачатак свята Юр'я.

Ёсць павер'е, што зорачкі ў Плеядах — гэта кураняткі, а самая яркая — іх маці-курыца. Па харвацкай легендзе гэтая курыца выратавала царкву! Калісьці даўно была адна царква, якую хацелі зруйнаваць непрыяцелі. Прыйшлі тыя ліхадумцы ўвечары і ссеклі дрэва насупраць будынка, дзе сядзела квактуха. Яна ўпала, пачала лётаць і крычаць — прачнуліся сяляне і абаранілі царкву. Злачынцы збеглі, і іх аніяк не маглі знайсці. У гэты момант жыхары пачулі ў небе чыйсьці крык і пайшлі на яго, пакуль не знайшлі, дзе схаваліся злачынцы. І крык курачкі заціх. Калі арыштоўвалі злачынцаў, нехта паглядзеў на неба, а там была купка зорачак, падобная да квактухі, якую гэтак і назвалі — Квочка.

### А што яшчэ?

Палярную зорку называлі Паўночнай або Зорным Калом. Хутчэй за ўсё апошняе — гэта татарскае запазычанне. Па іх легендах Вялікая Мядзведзіца — гэта конь, прывязаны да Зорнага Кала, які ходзіць вакол яго. Пра Паўночную зорку яшчэ гаварылі: «стаіць, як цвік». Сузор'е Дракона, які ўецца паміж Малой і Вялікай Мядзведзіцамі, называлі проста Змеем. Па павер'і гэта яго забіў святы Юрый, а Бог павесіў каля самай высокай зоркі, каб людзі памяталі пра такі гераічны ўчынак.

Шмат іншых назваў сузор'яў маюць хрысціянскія карані. Паўночную Карону атаясамляюць з цярновым вянком, які паклалі на галаву Хрыста. Лебедзь — сузор'е, якое добра бачна летам і восенню, — называлі Цароў Крэст. Ён звязаны з вобразам крыжа, на якім быў распяты Хрыстос. Капэлу — яркую зорку ў сузор'і Возніка — называлі Казой, дарэчы менавіта так яна перакладаецца з латыні, і звязвалі яе з Калядамі.

Вядома, што не маглі народныя павер'і абысці адзін з найбольш яркіх аб'ектаў зорнага неба — Венеру. Яе называлі Заранкай, Вечарніцай, Вочнай зоркай, Ведзьмай, Дзянніцай, Мар'яй (ранішнюю) і Дар'яй (вячэрнюю), Звярынай зоркай.

### Услед за птушкамі

Калі па грэчаскай міфалогіі Гера на небе малако разліла — і з'явіўся Млечны Шлях, то на беларускай зямлі вобраз нашай галактыкі на небе называлі Птушынай дарогай і казалі пра тое, што яна паказвае напрамак птушкам у вырай. Гавораць, што лётаюць па ёй кнігаўка, журавель, гусь, бусел і качкі. Яшчэ маглі называць яго Чумацкі шлях — гэта палескі і ўкраінскі варыянт, таму што чумакі соль вазілі з поўначы на поўдзень. А ўзімку Млечны Шлях акурат такім чынам зарыентаваны. Шэраг назваў звязаны з гарадамі: Дарога ў Кіеў, Дарога ў Іерусалім. Можа, святыя хадзілі туды па гэтай зорнай дарозе. Але і ў нас існуе легенда пра малако: калі Бог яшчэ хадзіў па зямлі, ён забараніў чорту яго піць. А той выменяў збан з малаком на самагон. Але Бог гэта заўважыў, пачаў бегчы за чортам, а той усё і разліў — атрымаўся Млечны Шлях.

На жаль, наша пагода не заўсёды дазваляе паназіраць за зоркамі з-за аблокаў. Але ў любы час убачыць іх можна ў праграме «Стэларыум». Дарэчы, там можна пагладзець на зоркі і вачамі нашых продкаў. З Цімафеем Авілiным звязваліся распрацоўшчыкі праграмы, каб ён паведаміў ім гэтыя легенды, па якіх бельгійскі мастак Ёхан Майрыс зрабіў малюнкі вобразаў сузор'яў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

anisovich@zviazda.by

#### СЛОЎНІК БЕЛАРУСКІХ ЗОРАК І СУЗОР'ЯЎ:

**Вялікая Мядзведзіца** — Воз, Калёсы, Конь, Калясніца, Гражуля Колы, Іллёў Воз, Давыдаў Воз, Коўш, Стажар, Ваўчыца.

**Малая Мядзведзіца** — Малы Воз, Малы Конь.

**Пояс Арыёна** — Касцы, Тры Сястры, Каромысел, Тры Каралі, Граблі, Асілкі, Матавіла, Ляска Якуба.

**Плеяды** — Сіта, Валасажар, Вісажар, Валосыня, Стажар'е, Куркі, Сяўцы, Кучкі, Карона, Гняздо, Сем Мальцаў.

**Палярная зорка** — Паўночная зорка, Зорны Кол.

**Дракон** — Змей.

**Валапас** — Араты.

**Лебедзь** — Пятрова Палка, Цароў Крэст, Чэсны Крэст.

**Касіяпея** — Касцы.

**Ліра** — Нявеста, Два Браты, Сапернік (толькі ў Караткевіча).

**Капэла** — Каза.

# «Дакрануцца» да калайдара

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пачынаючы з 2009 года штогод вучэбна-навуковы цэнтр Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў арганізуе навуковыя школы для настаўнікаў фізікі на рускай мове. Праграмы праводзяцца на базе найбуйнейшых сусветных навуковых цэнтраў — Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў і Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў (CERN). Іх мэта — скарачэнне «адлегласці» паміж школай і фундаментальнай навукай, а таксама распаўсюджванне сучасных навуковых ведаў сярод шырокай аўдыторыі, — тлумачыць настаўніца. — Кандыдатаў на ўдзел у Жэнеўскай навуковай школе выбіралі з прадстаўнікоў 20 краін, якія ўваходзяць у гэту арганізацыю. Каб стаць удзельнікам праграмы, трэба было зайсці на сайт праекта http://teachers.jinr.ru і запоўніць анкету. Далей арганізатары ўжо самі «гугляць» і вывучаюць тваю прысутнасць у інтэрнэце — чым больш «наследзіў», тым лепш. Пад увагу бяруцца водгукі вучняў, твая дзейнасць і дасягненні... У выніку ўдзельнікамі тыднёвай міжнароднай школы змаглі стаць 23 настаўнікі з Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана, Азербайджана і Беларусі. Я была пятым прадстаўніком ад нашай краіны за ўвесь час правядзення навуковай школы CERN, а ў гэтым годзе — адзіным.

Школа праходзіць непасрэдна на тэрыторыі Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў непадалёк ад Жэневы. CERN — цэнтр сучаснай фізікі. На яго тэрыторыі размяшчаецца Вялікі адронны калайдар. Арганізацыя стваралася пад эгідай ЮНЕСКА і з самага пачатку ставіла сваёй задачай зрабіць перадавыя веды і адкрыцці даступнымі грамадству.

**— Калі пасля свайго запуску ў 2008 годзе калайдар менш чым праз два тыдні спыніўся, прычым надоўга, ён стаў «героем» загалоўкаў у жоўтай прэсе і аб'ектам для жартаў, маўляў, колькі ж грошай пусцілі на вецер. Тым больш што даследаванні, якія там праводзяцца, знаходзяцца па-за межамі разумення большасці з нас...**

— Вялікі адронны калайдар — самы магутны паскаральнік зараджаных часціц на сустрэчных пучках, які прызначаны для разгону пратонаў і цяжкіх іонаў (іонаў свінцу) і вывучэння прадуктаў іх сутыкненняў. Гэта самая буйная эксперыментальная ўстаноўка ў свеце. У будаўніцтве і даследаваннях удзельнічалі і ўдзельнічаюць больш за 10 тысяч навукоўцаў і інжынераў больш чым са ста краін. «Вялікім» ён названы з-за сваіх памераў: даўжыня асноўнага кальца паскаральніка складае амаль 27 кіламетраў. «Адронным» — таму што паскарае адроны (цяжкія часціцы, якія складаюцца з кваркаў). А «калайдарам» (англ. Collider — сутыкненне) — з-за таго, што пучкі часціц паскараюцца ў процілеглых напрамках і сутыкаюцца ў спецыяльных кропках.



Выява дэтэктара CMS у натуральным памеры ў офісе CERN.

Для даследавання вынікаў гэтых сутыкненняў у чатырох кропках скрыжавання пучкоў устаноўлены дэтэктары. Дэтэктар ATLAS прызначаны для пошуку новых невядомых часціц, якія могуць падказаць навукоўцам шляхі да «новай фізікі», адметнай ад стандартнай мадэлі. Дэтэктар CMS — для атрымання базона Хігса і даследавання цёмнай матэрыі. Дэтэктар ALICE — для даследавання матэрыі пасля Вялікага выбуху і пошуку кварк-глюоннай плазмы, а дэтэктар LHCb даследуе прычыну прэваліравання матэрыі над антыматэрыяй. Каб уявіць маштабы, дастаткова сказаць, што на дзвюх самых вялікіх устаноўках — ATLAS і CMS — задзейнічаны прыкладна па дзве тысячы чалавек. У ATLAS гэта дзве тысячы чалавек з 35 інстытутаў! А кошт кожнай з іх перавышае паўмільярда долараў.

**— Вы згадалі даследаванні антыматэрыі. Гэта ўвогуле нешта з разраду фантастыкі...**

— Прызнаюся, што калі мы з калегамі апынуліся на фабрыцы антыматэрыі, то было ўражанне, што мы знаходзімся за межамі рэчаіснасці — настолькі неверагоднымі здаюцца эксперыменты, якія тут праводзяць. Але ж іх вынікі цалкам рэальныя: даказана, што тэрапія анкалагічных захворванняў антыпратонамі ў чатыры разы больш эфектыўная, чым іх антычасціцамі — звычайнымі пратонамі. Менавіта паскаральнік зараджаных часціц на гэтай фабрыцы дазваляе атрымліваць высакаякасны і пры гэтым нізкаэнергетычны пучок антыпратонаў — такі, які патрабуецца для біямедыцынскіх даследаванняў.

Увогуле, праграма для педагогаў была вельмі насычаная: гэта і цікавыя лекцыі аб сучаснай фізіцы, і сустрэчы з навукоўцамі-фізікамі ў рабочай і нефармальнай атмасферы, экскурсіі, сесіі пытанняў і адказаў. Настаўнікам была дадзена магчымасць наведаць эксперыментальныя ўстаноўкі Вялікага адроннага калайдара, а таксама цэнтр кіравання LHC CCC, выпрабавальную ўстаноўку SM18 для тэсціравання магнітаў пры нізкіх тэмпературах.

Удзельнікі школы таксама знаёміліся з эксперыментам AMS — гэта першы вялікі магнітны спектрометр, які працуе ў космасе. Падчас наведвання мы бачылі ў рэжыме рэальнага часу на вялікім экране касманаўтаў, якія знаходзяцца на Міжнароднай касмічнай станцыі. Акрамя гэтага, наведалі вядомы музей «Мікракосм», вучэбна-даследчую фізічную лабараторыю S'Cool Lab і медыйны цэнтр «Глобус». Ва ўсіх памяшканнях CERN — шмат вялікіх экранаў, на якіх бачныя вынікі даследаванняў, якія адбываюцца на паскаральніках у рэальным часе. Нават у ліфце гатэля, дзе мы жылі, былі такія ж экраны. А ў фізічнай лабараторыі настаўнікі самі праводзілі эксперымент па стварэнні камеры Вільсана для выяўлення трэкаў элементарных часціц. Мы пабывалі пад зямлёй на глыбіні 80 метраў у тунэлі, дзе побач за сцяной ляцяць з хуткасцю, блізкай да хуткасці святла, згусткі пратонаў, вельмі магутныя дэтэктары фіксуюць сутыкненні часціц, а трэкі малююць карціны будучых адкрыццяў.

**— А ці ўдалося вам знайсці сляды прысутнасці на калайдары беларускай навукі?**

— У CERN асабліва адчуваецца яднанне навукоўцаў усяго свету, якое дазваляе скараць самыя неймаверныя вяршыні, адкрываць самыя складаныя пытанні светабудовы. Я, напрыклад, з гонарам даведалася, што беларускія навукоўцы і інжынеры таксама паспяхова ўдзельнічалі ў стварэнні складаных сістэм эксперыментальных установак у CERN. Гаворка ідзе пра стварэнне вузлоў і дэталяў дэтэктара ATLAS. Супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій БДУ сумесна з Мінскімі трактарным і станкабудаўнічым заводамі вырабілі і паставілі ў Швейцарыю буйнагабарытныя дэталі каларыметрычнай і магнітнай падсістэм дэтэктара. Не так даўно нашы фізікі атрымалі новы заказ на распрацоўку элементаў электронікі, неабходных для счытвання сігналаў з мюонных камер — высокадакладных вырабаў для рэгістрацыі высокаэнергетычных часціц на эксперыментальных устаноўках калайдара.

Удзел у навуковай школе і магчымасць убачыць на свае вочы дасягненні чалавечага розуму далі магутны імпульс да развіцця. Дакрануўшыся да вялікай навукі, хочацца далучаць да яе цудоўнага свету і сваіх вучняў, паказваць ім прыгажосць навуковых адкрыццяў, перадаваць дзецям разуменне актуальнасці фізікі ў нашым жыцці, настройваць на правільны выбар жыццёвага шляху. І, вядома ж, яшчэ больш зацікавіць вывучэннем таямніц светабудовы, ну і, вядома, вывучэннем фізікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ❍ Даведка

У 2017 годзе Вялікі адронны калайдар адзначыў своеасаблівы юбілей: на ім адбылося 10 000 000 000 000 000-е сутыкненне часціц. Гэта рэкорд для паскаральнікаў высокай энергіі.

Летась фізікамі, якія праводзілі эксперыменты на калайдары, было зроблена некалькі істотных дасягненняў, пачынаючы з вылучэння прыкмет адрознення паміж матэрыяй і антыматэрыяй і заканчваючы верагодным зліццём кваркаў — часціц, якія ўваходзяць у склад іншых элементарных часціц, што цягне за сабой вылучэнне велізарнай колькасці энергіі.

У ліпені на калайдары знайшлі пентакваркі — субатамныя часціцы, існаванне якіх раней лічылася недаказаным. Такім чынам эксперыменты пахіснулі стандартную мадэль фізікі.

Зараз Вялікі адронны калайдар спынены на працяглыя канікулы: тут праводзяцца планавыя тэхнічныя работы. Яго запусцяць толькі ў сакавіку 2018 года.

■ Не прапусці

## НА ЭКСКУРСІЮ — У АКАДЭМІЮ НАВУК

**У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Дню беларускай навукі, на Дні адчыненых дзвярэй запрашае Музей гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук.**

Музей быў адкрыты ў 1989 годзе — да 60-годдзя акадэміі. Унікальны ён па многіх прычынах. Падобных музеяў не мае больш ніводная Акадэмія навук на постсавецкай прасторы. Толькі тут можна прасачыць гістарычнае развіццё беларускай навукі ў комплексе. Экспазіцыя адлюстроўвае асноўныя этапы станаўлення і развіцця акадэмічнай навукі ў Беларусі, гісторыю фарміравання сучаснай арганізацыйнай структуры Акадэміі навук, дасягненні і вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці яе вучоных і арганізацый, этапы станаўлення акадэмічных навуковых школ у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, медыцынскіх, гуманітарных, сацыяльных і іншых навук.

У музеі прадстаўлены матэрыялы аб арганізацыі навукі ў Беларусі з моманту стварэння Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Асобныя раздзелы экспазіцыі прысвечаны пытанням дзяржаўнага кіравання навукай і міжнародным навукова-тэхнічным сувязям. Плошча памяшкання музея складае больш за 250 квадратных метраў, у яго фондах налічваецца каля 13 тысяч экспанатаў, з якіх больш як 3,5 тысячы прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі.

Музей размяшчаецца ў будынку галоўнага корпуса Акадэміі навук (праспект Незалежнасці, 66) і адкрыты штодня з 11.00 да 17.00 (для групавых экскурсій неабходная папярэдняя дамоўленасць). Школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў і ўсіх ахвотных тут чакаюць да 3 лютага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

## ЗАПАСАЎ КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ ПАБОЛЬШАЛА

**Паводле інфармацыі рэспубліканскай камісіі па запасах карысных выкапняў, беларускімі геолагамі ў 2017 годзе забяспечаны прырост запасаў па шэрагу карысных выкапняў, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Так, мінеральна-сыравінная база краіны прырасла запасамі калійных солей у колькасці 389 мільёнаў тон, торфу — 8,9 мільёна кубічных метраў, жвірова-пясчанай сумесі і будаўнічых пяскоў — 19,9 мільёна кубічных метраў, грунтоў для дарожнага будаўніцтва — 3 мільёны кубічных метраў, глін — 475 тысяч тон, сапрапелю — 476 тысяч тон. Балансавыя запасы падземных вод павысіліся па прэсных пітных водах на 29,5 тысячы кубічных метраў у суткі, па прыродна-сталовых лячэбна-сталовых мінеральных водах — на 192,3 кубічных метраў у суткі. Яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўваюцца запасы калійных і каменных солей, даламіту, мелу і мергельна-крэйдавых парод, шкляных і сілікатных пяскоў, будаўнічага каменю, гліністай сыравіны, торфу, сапрапелю, прэсных і мінеральных падземных вод. Перспектыўныя для выяўлення — радовішчы рэдкіх і рэдказямельных руд, бурштыну, валастаніту, пірафіліту і іншых карысных выкапняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

## З КАЗАХСТАНА — З «БРОНЗАЙ» І «СЕРАБРОМ»

**Навучэнцы Ліцэя БДУ заваявалі восем медалёў на XIV Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы, якая прайшла ў Алматы (Казахстан).**

З сярэбранымі медалямі вярнуліся адзінаццацікласнікі Арына Галубіцкая і Андрэй Шакель. «Бронза» ў гэтай катэгорыі — на рахунку ліцэіста з 10-га класа Уладзіслава Зверыка. Па фізіцы трэцяе месца заваявалі адзінаццацікласнікі Яўген Ганковіч і Уладзіслаў Фядурка. У лік лепшых інфарматыкаў увайшлі сярэбраны прызёр адзінаццацікласнік Мікіта Сячко і ўладальнікі «бронзы» адзінаццацікласнік Раман Міхнюк і дзесяцікласнік Ягор Каляда.

У XIV Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе ўдзельнічалі больш за 470 школьнікаў у складзе 70 каманд з 15 краін. Гэта сумесны праект рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Дарын» і Рэспубліканскай спецыялізаванай фізіка-матэматычнай сярэдняй школы-інтэрната імя Арымбека Жаўтыкава для адораных дзяцей.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ВЕТРАЗІ КАРАЛЕЎСТВА



## На што спадзяецца Данія

**Амаль палова спажытай у Даніі летась электраэнергіі — рэкордныя для ўсяго свету 43,4 працэнта — была згенераваная з дапамогай ветраных установак. Пра гэта паведаміў агенцтву Reuters міністр клімату і энергетыкі краіны Ларс Крысціян Лілехольт. «Гэта будзе не апошні рэкорд, які мы ўстанаўліваем», — заявіў міністр, растлумачыўшы, што краіна ў будучыні мае намер цалкам адмовіцца ад выкапнёвых энерганосьбітаў на карысць аднаўляльных крыніц энергіі. На што спадзяецца Данія?**

### ПАЎНОЧНЫ ХАЙ-ТЭК

Данія — самая паўднёвая са скандынаўскіх краін, яна абмываецца Балтыйскім і Паўночным морамі. Тэрыторыя каралеўства ўключае ў сябе вялікі паўвостраў Ютландыю і 409 астравоў Дацкага архіпелага. Фармальна ў склад краіны ўваходзіць самы буйны ў свеце востраў — Грэнландыя, а таксама Фарэрскія астравы. Аднак гэтыя тэрыторыі карыстаюцца самакіраваннем, якое робіць іх практычна незалежнымі. Плошча краіны складае каля 43 тыс. кв. кіламетраў (працягласць берагавой лініі — звыш 7,3 тыс. км), колькасць насельніцтва, паводле апошніх даных, — 5,7 млн чалавек. Данія — канстытуцыйная манархія, кіраўніком дзяржавы з'яўляецца манарх, які ажыццяўляе заканадаўчую ўладу сумесна з аднапалатным парламентам — фолькетынгам. Гэтая краіна з'яўляецца членам ЕС з 1973 года, але дагэтуль не ўваходзіць у Еўразону. Паўночнае каралеўства — адзін з заснавальнікаў НАТА і Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР).



Дацкая эканоміка — сучасная рынкавая сістэма, якая ўключае ў сябе высокатэхналагічную сельскую гаспадарку, прамысловасць, шырокія меры дзяржаўнай падтрымкі, высокі ўзровень жыцця, а таксама значную залежнасць ад знешняга гандлю. Вядучыя галіны — металаапрацоўка, машынабудаванне (асабліва электратэхнічнае і радыёэлектроннае), харчовая, хімічная, цэлюлозапапяровая, тэкстыльная, моцная і прыбытковая вытворчасць хай-тэк. У сельскай гаспадарцы вядучая роля належыць мясамалочнай жывёлагадоўлі. Данія з'яўляецца стратэгічным транспартным хабам. Доўгі час адной з вядучых галін прамысловасці краіны было суднабудаванне, але за апошні час яго доля ў сусветнай вытворчасці скарацілася.

У дацкай эканоміцы заўсёды пераважалі малыя і сярэднія прадпрыемствы. Урад актыўна падтрымлівае і развівае стартапы, стымулюючы прадпрымальнікаў генераваць новыя ідэі, ствараць інавацыйныя праекты і працоўныя месцы. У Даніі можна хутка і без стартавага капіталу зарэгістраваць уласную кампанію, маючы ўсяго 1 крону (32 капейкі), пры гэтым яна вызваляецца ад выплаты падаткаў да таго часу, пакуль абаротны капітал не перавысіць 50 тысяч крон (каля 16 тыс. рублёў). Кампанію можна зарэгістраваць анлайн на працягу 15 хвілін, падаўшы электронную заяўку і запоўніўшы ўсе неабходныя дакументы. Урад краіны аказвае фінансавую падтрымку найбольш тэхналагічным і інавацыйным стартапам. Так, дапамога кампаніям за чатыры гады склала 128 млн еўра. Ініцыятыва ўрада стымулявала і прыватных інвестараў, аб'ём інвестыцый якіх у стартапы ўжо перавысіў дзяржаўныя ў пяць разоў.

Дарэчы, прызначаны першы ў свеце «лічбавы» пасол МЗС Даніі для ўзаемадзеяння з сусветнымі лідарамі IT-бізнесу. Ва ўрадзе лічаць, што сусветныя IT-кампаніі сталі чымсьці накшталт новых краін, і дзяржава павінна рэагаваць адпаведным чынам. Карпарацыі станоўча паставіліся да ініцыятывы. Напрыклад, IBM адкрывае ў Капенгагене цэнтр па распрацоўцы праграмнага забеспячэння, а Apple і Facebook вядуць будаўніцтва ў краіне буйных data-цэнтраў.

### АМБІЦЫЙНАЯ МЭТА

Данія бедная карыснымі выкапнямі, таму залежыць ад знешняга рынку. Аднак у плане энергарэсурсаў гэтая краіна цалкам самадастатковая — вядзецца здабыча нафты, прыроднага газу, энергія выпрацоўваецца пры дапамозе ветраной, сонечнай і біяэнергетыкі. Каралеўства ў сусветных лідарах па долі даходаў ад выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі ў ВУП. Цяпер у гэтай сферы занятыя 67 тысяч чалавек — удвая больш, чым у нафтагазавай галіне.

Каралеўства з'яўляецца «калыскай» ветраэнергетыкі. Дацкая Vestas з'яўляецца найбуйнейшым у свеце вытворцам ветрагенератараў, а Orsted (былая DONG Energy) — найбуйнейшым будаўніком ветрапаркаў марскога базавання. Летась ветрагенератары ў Даніі выпрацавалі 14,7 тысячы ГВт/гадзін, паведаміла Renewables Now са спасылкай на дацкую энергетычную асацыяцыю (DEA). Краіна з кожным годам павялічвае магутнасці ветрагенератараў. Па звестках DEA, з 2001-га агульная магутнасць ветравых электрастанцый (ВЭС) вырасла ўдвая. Пры гэтым колькасць турбін зменшылася на 20 працэнтаў. Гэта тлумачыцца ўдасканаленнем тэхналогій — для выпрацоўкі адпаведнай колькасці энергіі патрабуецца менш установак.

Агульная магутнасць ВЭС у Даніі — як наземных, так і марскіх — складае 5,3 ГВт. Апошнія 15 гадоў каралеўства ўпэўнена лідзіруе ў выпрацоўцы электрычнасці ветравымі электрастанцыямі сярод краін АЭСР. Толькі за апошні год краіна ўстанавіла некалькі новых рэкордаў. Як стала вядома ў студзені 2017-га, ветравая турбіна ў горадзе Остэрлід за суткі выпрацавала амаль 216 тысяч кВт/гадзін электраэнергіі. Гэтага дастаткова, напрыклад, каб забяспечваць электрычнасцю стандартны амерыканскі дом на працягу 20 гадоў. У зімовыя месяцы ў краіне ўстанаўліваецца ветранае надвор'е — як следства, ВЭС б'юць новыя рэкорды. У лютым мінулага года ветравыя турбіны Даніі выпрацавалі дастаткова электраэнергіі, каб забяспечыць патрэбы ўсёй краіны. Ветрагенератары на сушы выпрацавалі 70 ГВт/гадзін энергіі, а марскія станцыі дадалі яшчэ 27 ГВт/гадзін.

Гэтыя лічбы адлюстроўваюць значнае павелічэнне долі вытворчасці аднаўляльнай энергіі ў каралеўстве з 2008 года, калі яна складала ўсяго 19,3 працэнта. «Мы яшчэ раз паказалі ўсяму свету, што ў Даніі найлепшая энергетычная сістэма ў свеце», — сказаў міністр Ларс Крысціян Лілехольт у заяве для прэсы. У найбліжэйшыя гады ў каралеўстве будуць устаноўлены новыя ветраныя электрастанцыі. «Урад прыкладае намаганні да таго, каб да 2030 года ў Даніі не менш за 50 працэнтаў энергетычных патрэб краіны было пакрыта за кошт аднаўляльных крыніц энергіі, такіх як энергія ветру і сонечная энергія. Гэта вельмі амбіцыйная мэта таксама можа прывесці да стварэння новых працоўных месцаў у каралеўстве», — заўважыў Лілехольт. «Сувязі з еўрапейскім рынкам таксама дазваляюць дацкім вытворцам прадаваць ветраэнергетыку за мяжу», — адзначаецца ў паведамленні міністэрства клімату і энергетыкі краіны, паведамляе The Local.

### РАЗВІТАННЕ З ВУГЛЕВАДАРОДАМІ

Нафтавы крызіс 1973 года нанёс моцны ўдар па дацкай эканоміцы, следствам чаго стала ўнутраная палітычная нестабільнасць: цягам наступнага дзесяцігоддзя ні адной партыі не ўдалося сфарміраваць доўгатэрміновую ўрадавую кааліцыю. Не дзіўна, што Данія адкрыта дэманструе сваю цікавасць да аднаўляльных крыніц энергіі. Хоць на тэрыторыі краіны працягваецца здабыча «чорнага золата», каралеўства ўжо не валодае ніводнай нафтавай кампаніяй. У жніўні мінулага года дацкая кампанія AP Moller-Maersk абвясціла аб продажы свайго нафтагазавага прадпрыемства французскаму гіганту Total за $7,45 млрд. Гэтае падраздзяленне займаецца здабычай і перапрацоўкай нафты і газу, якія здабываюцца ў Паўночным моры, а таксама ўдзельнічае ў розных праектах у Казахстане, Алжыры, Анголе, Кеніі, Бразіліі, Іраку і Мексіканскім заліве. У 2016 годзе аб'ём здабычы склаў 313 тыс. бараляў у нафтавым эквіваленце ў дзень. «Гэта пагадненне прыкметна ўмацуе фінансавую гнуткасць нашай кампаніі і вызваліць рэсурсы для канцэнтрацыі на такіх відах дзейнасці, як кантэйнерныя перавозкі, парты і лагістыка», — адзначыў гендырэктар Moller-Maersk Сэрэну Скоў.

Гэта была апошняя нафтагазавая кампанія, якая належыць Даніі. Продаж Maersk Oil французам адбыўся ўсяго праз некалькі месяцаў пасля таго, як дзяржаўная дацкая энергакампанія Dong Energy прадала брытанскай нафтахімічнай кампаніі INEOS увесь свой нафтагазавы бізнес. Каралеўства развітваецца з вуглевадародамі — Капенгаген пазбаўляецца ад апошніх нафтагазавых актываў.

Як адзначае інфармагенцтва Bloomberg, нафта і газ яшчэ спатрэбяцца Даніі, бо менавіта гэтыя рэсурсы дапамогуць фінансаваць пераход на чыстую энергетыку. Па ўмовах здзелкі, Total працягне распрацоўку «чорнага золата» ў Паўночным моры. «Чым больш грошай яны заробяць у Паўночным моры, тым больш мы зможам выдаткаваць на пераход да «зялёнай» энергетыкі», — цытуе міністра энергетыкі Даніі Ларса Крысціяна Лілехольта Bloomberg. Дарэчы, цяпер паўночны захад Еўропы займае 7-е месца сярод самых актыўных рэгіёнаў па выпрацоўцы нафты і газу ў свеце.

Распродаж нафтагазавых актываў найбуйнейшымі дацкімі прыватнымі і дзяржаўнымі кампаніямі ўваходзіць у рамкі доўгатэрміновай стратэгіі дацкіх улад па нарошчванні долі крыніц аднаўляльнай энергетыкі ў агульнай энергагенерацыі, што было яшчэ раз пацверджана ў праграмным дакладзе дацкага ўпраўлення па энергетыцы за мінулы год. Упраўленне адзначае, што ў 2015-м у Даніі 56 % электрычнага спажывання і 51 % цеплазабеспячэння жылых дамоў забяспечваліся аднаўляльнымі крыніцамі — ветрам, сонцам, біяпалівам. Да 2020 года дацкі ўрад плануе давесці долю аднаўляльных крыніц у вытворчасці электрычнасці да 72 %, а ў ацяпленні — да 71 %.

Зрэшты, энергетычнае ўпраўленне Даніі адзначае, што пасля 2020-га, калі ў ЕС спыніцца дзеянне цяперашняй праграмы EU Energy Efficiency Directive па субсідаванні альтэрнатыўнай энергетыкі, развіццё гэтага сектара можа запаволіцца. Напрыклад, сістэма адабрэння дзяржаўнай дапамогі пры будаўніцтве наземных ветраных электрастанцый завершыцца ў 2018 годзе, заводаў па вытворчасці біяпаліва — у 2019-м, а па вытворчасці біягазу — у 2023-м. У сувязі з гэтым упраўленне лічыць, што неабходна ўжо зараз пачаць ацэнку эканамічнай мэтазгоднасці далейшага развіцця аднаўляльнай энергетыкі, а для гэтага «неабходна, каб было прынята палітычнае рашэнне аб працягу субсідавання такіх тэхналогій».



Дарэчы, днямі Еўрапарламент ухваліў стратэгічны план «чыстая энергія», які быў вынесены на галасаванне Еўракамісіяй. Як адзначае Euronews, у імкненні дамагчыся поўнай адмовы ЕС ад выкарыстання выкапнёвага паліва Еўрапарламент праявіў сябе яшчэ больш рашуча, чым Еўрапейская камісія. Апошняя настойвала на тым, каб да 2030 года 27 % спажыванай у супольнасці энергіі паступала з аднаўляльных крыніц. Заканадаўцы ж вырашылі давесці гэтую долю да 35 %. Далей Брусэлю трэба будзе перыяд складаных перамоў з урадамі краін — членаў Еўрасаюза. Бакі павінны выпрацаваць агульную пазіцыю да лета бягучага года. А ўласна Данія свой выбар ужо зрабіла і ўпэўнена рушыць па вызначаным шляху.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

# «Маржы», «цюлені», «белыя мядзведзі»

## У Мінску праходзіць Адкрыты чэмпіянат Беларусі па спартыўным зімовым плаванні і III этап Кубка свету

**Спаборніцтвы працягнуцца да 21 студзеня ў акваторыі Свіслачы за Палацам спорту ў адкрытым ледзяным басейне 25х25. У турніры бяруць удзел больш за 400 спартсменаў з 18 краін. Удзельнікі разбіты на 13 узроставых катэгорый, праявіць сябе могуць плыўцы любога ўзросту, самаму юнаму ўдзельніку — восем гадоў, а самы дасведчаны спартсмен разменяў дзявяты дзясятак — яму 87.**

### Насмарк і прастуды не пагражаюць

Спартыўная праграма ўключае ўсе дыстанцыі ад 25 да 450 метраў. На тое, каб падрыхтаваць ледзяны басейн, у арганізатараў сышло шэсць сутак, работа не спынялася нават уначы. Гэта сябе апраўдала, бо на беразе Свіслачы гэтымі днямі сабралася маса народу з добрым настроем і ў яркіх фарбах.

— Мы бачым, што з кожным годам людзей, якія займаюцца гэтым відам спорту, становіцца ўсё больш, — расказвае **старшыня Беларускай федэрацыі загартоўвання і спартыўнага зімовага плавання Уладзімір ШУЛЬГАН.** — За апошнія гады — сотні і тысячы акунанняў. У заключны дзень спаборніцтваў, 21 студзеня, пройдуць паказальныя выступленні спартсменаў, у гэты ж дзень паспрабаваць сябе ў нашым басейне зможа любы ахвотны.

Уладзімір Васілевіч адзначае, што яшчэ тыдзень таму планавалася праводзіць спаборніцтвы ў адкрытым басейне без лёду, таму стварылі пластыкавыя пантоны, але паколькі за некалькі дзён да старту выпаў снег і ўсталяваліся маразы, планы змяніліся. Сёння лёд на Свіслачы — 12 см, тэмпература вады — 1-2 градусы.

— У першы дзень турніру нават была завіруха, а спартсмены пераадольвалі дыстанцыю ў 450 метраў, такіх плыўцоў называюць «белымі маржамі», пазмагаўшыся на дыстанцыі, яны пераходзяць у яшчэ больш высокую катэгорыю — «белыя мядзведзі», — адзначае старшыня федэрацыі.

Насмарк і прастуды плыўцам не пагражаюць, бо гэтыя хваробы не могуць з'явіцца ад акунання ў ледзяную ваду, захварэць спартсмен можа толькі ад дрэнных умоў для пераапранання на сушы ўжо пасля заплыву. Арганізатары мінскіх спаборніцтваў паклапаціліся пра гэта выдатна: на беразе ўдзельнікаў чакаюць лазні і бочкі з гарачай вадой.

Тут жа, клапоцячыся пра бяспеку спартсменаў і гледачоў, дзяжураць атрады МНС і АСВОДа. **Начальнік манеўрана-пошукавай групы вадалазна-выратавальнай службы Мінска Антон ПРОФІТ** адзначае: нягледзячы на тое, што з надыходам маразоў працы ў яго службы значна дадалося, няшчасных выпадкаў на падобных спаборніцтвах ніколі не было.

— Ствараем бяспеку на вадзе на падобных мерапрыемствах пастаянна, назіраем за выкананнем правілаў бяспекі, гатовыя аказаць дапамогу, калі раптам чалавек у вадзе адчуе дыскамфорт, усё ж такі зімовае плаванне — гэта стрэс для арганізма, — адзначае спецыяліст.

### Вада бадзёрыць

Правядзенне этапу Кубка свету ў Мінску — яшчэ своеасаблівая прэзентацыя Беларусі, бо наша краіна прэтэндуе на права правядзенне чэмпіянату свету па зімовым плаванні ў 2020 годзе. А ўжо ў студзені гэтага года планетарнае першынство пройдзе ў Эстоніі, у гэтым турніры прымуць удзел спартсмены больш чым з 40 краін.

Зараз і ў Мінску сабралася шмат гасцей, самая вялікая дэлегацыя прыбыла з Расіі, таксама мы заўважылі спартсменаў з Украіны, Польшчы, Латвіі, Швецыі і Эстоніі.

Плывец з Таліна Еркі Касенур з сябрамі вырашыў дабірацца да Мінска на машыне, у Рызе яна зламалася, таму, каб трапіць на турнір і не спазніцца, ім давялося перасесці на аўтобус.



— Год таму мне захацелася паспрабаваць у жыцці нешта новае, спачатку думаў заняцца парашутным спортам, але пазней убачыў, што ў Таліне праходзіць чэмпіянат па зімовым плаванні, падумаў, чаму б не. Раней плаваў толькі летам у рацэ ці моры. Да гэтага часу добра памятаю сваё першае акунанне, праз пару гадзін адчуў небывалы прыліў энергіі. У нас у Эстоніі гэты від спорту вельмі папулярны, ёсць цэлыя клубы. У лістападзе я быў на турніры ў Латвіі, у снежні — у Эстоніі, убачыў, што ў студзені спаборніцтвы сусветнага ўзроўню будуць у Мінску, ні разу не быў у Беларусі, таму вырашыў ехаць. Ужо ўдалося паглядзець ваш горад, ён вельмі ўражвае.

На турнір заяўляюцца цэлымі сем'ямі, прыклад гэтаму — Гнетчыкі. Мама Аксана ўдзельнічае тут са сваімі дзецьмі Акімам і Марыяй. Дарэчы, менавіта Акім — самы юны плывец: яму ўсяго восем гадоў.

— Усё пачалося з дачкі, ёй 13, але яна прымае ўдзел у чэмпіянатах па зімовым плаванні ўжо не першы раз, а вось у мяне гэта ўсяго другая спроба, як і ў Акіма, — расказвае Аксана.

У натоўпе ўдзельнікаў вока выхоплівае знаёмы твар, гэта ж трэнер нацыянальнай каманды па сучасным пяцібор'і Алена Нырцова, яна выходзіць з ледзянога басейна з усмешкай.

— Мне ж ужо за 50, а як быццам 20. Гэта сапраўды шлях да даўгалецця! Вада бадзёрыць! Прымаю ўдзел і ў нашых спаборніцтвах, і ў міжнародных ужо некалькі гадоў, самаадчуванне за гэты час змянілася, ніякіх прастудных захворванняў. Псіхалагічна складана настроіцца, але, пераадольваючы сябе, становішся на прыступку вышэй ва ўласных вачах, не кажучы ўжо пра блізкіх, сяброў, вучняў.





### «Людзі з маім захворваннем прыкаваныя да ложка, а я стаю перад вамі»

Людміла Жураўлёва прыляцела з Хабараўска, перад стартам яна прызнаецца, што не спала ўжо суткі і вельмі змерзла на вакзале, але ў сваё 79 холаду ў вадзе не баіцца.

— Я яшчэ спартсмен-пачатковец *(смяецца)*, займаюся зімовым плаваннем усяго два гады, выступаю на дыстанцыях 25 м і 50 м вольным стылем. Пакуль у мяне ўсяго дзве ўзнагароды, спадзяюся дадаць медаль з Мінска. За час, як пачала маржаваць, ні разу не хварэла і не хадзіла ў паліклініку.

А вось 72-гадовая Рыма Васільчук з Арла ўжо куды больш дасведчаная плывуха, у яе актыве — 130 медалёў, 52 з якіх — залатыя.

— Ужо збілася з ліку ва ўзнагародах, я стала гартавацца з 7 класа, стаж маржавання — 16 гадоў, у спаборніцтвах па зімовым плаванні ўдзельнічаю 10—11 гадоў. У 2001-м атрымала пажыццёвую інваліднасць, у маладосці займалася спартыўнай гімнастыкай, маю 1-ы разрад па гэтым відзе спорту і 2-і — па скачках у ваду. Вялікі спорт разбурыў мой пазваночнік. Пасля нараджэння траіх дзяцей у 35 гадоў я звалілася з ног і толькі тады зразумела, што трэба нешта прадпрымаць. Дзякуючы зімоваму плаванню я жывая, з маім захворваннем людзі ляжаць на ложку ці ў магіле, а я стаю перад вамі, — дзеліцца Рыма Пятроўна.

* * *

Беларуская федэрацыя загартоўвання і спартыўнага зімовага плавання ўтварылася ў 2015 годзе. Звычайна сезон для беларускіх спартсменаў складаецца з шасці этапаў, усе яны ўваходзяць у міжнародны каляндар. Дарэчы, менавіта Беларусь стала першай краінай, якая афіцыйна прызнала зімовае плаванне спортам. Гэта адбылося ў канцы 2016 года, калі яго занеслі ў нацыянальны рэестр відаў спорту.

Звычайна вада ў палонцы прэснага вадаёма мае тэмпературу ад 0 да 4 градусаў. У моры ўмовы больш жорсткія.

У розных краінах маюцца таксама свае назвы, звязаныя з якой-небудзь марской істотай. У нас, у Расіі і ў Польшчы гэта — маржаванне, а людзі, якія займаюцца зімовым плаваннем, адпаведна — «маржы». У Фінляндыі — «выдры», «нерпы» і «цюлені», у Паўночнай Амерыцы — «белыя мядзведзі».

Найбольш папулярнае зімовае плаванне — у Фінляндыі, дзе яно звязана з культурай і распаўсюджанасцю саўны і лазні. Колькасць людзей, якія пастаянна займаюцца гэтым відам спорту, купаюцца ў палонцы 1-2 разы на тыдзень, каля 120 тысяч. Тут з 1989 года праводзяцца спаборніцтвы па зімовым плаванні. Дарэчы, у першым, у Тампэрэ, было ўсяго 110 удзельнікаў. Першы сусветны чэмпіянат прайшоў у Хельсінкі ў 2000 годзе. У 2008-м чэмпіянат свету ўпершыню прайшоў за межамі Фінляндыі — у Лондане.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

---

■ Узнагарод стане больш

# КОЛЬКАСЦЬ РАЗЫГРАНЫХ МЕДАЛЁЎ НА II ЕЎРАГУЛЬНЯХ ПАВЯЛІЧЫЦЦА

**Пра гэта ў ходзе пасяджэння выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў расказаў дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій Катулін**

*— Колькасць разыграных камплектаў медалёў павялічыцца да 208. З'явяцца тры новыя дысцыпліны ў стральбе з лука, яшчэ па дзве вагавыя катэгорыі дададуцца ў жаночай, вольнай і грэка-рымскай барацьбе. На адзін від праграмы стане больш у спаборніцтвах па веславанні на байдарках і каноэ. Гэта мужчыны каноэ-двойка 200 метраў, на гэтай дыстанцыі дзеючым чэмпіёнам свету з'яўляецца беларус Арцём Козыр,* — адзначыў дырэктар.

Нагадаем, у праграму II Еўрагульняў увайшлі 15 відаў спорту: бадмінтон, баскетбол 3х3, бокс, барацьба (грэка-рымская, вольная, жаночая), веласіпедны спорт (трэк і шашы), гімнастыка (спартыўная, мастацкая, акрабатыка, аэробіка і скачкі на батуце), грэбля на байдарках і каноэ, дзюдо, каратэ, лёгкая атлетыка, самба, стральба з лука, стральба (кулявая і стэндавая), настольны тэніс, пляжны футбол.

Таксама стала вядома, што краіну-гаспадыню III Еўрапейскіх гульняў плануюць абраць у канцы 2018 года. Пра гэта паведаміў падчас пасяджэння выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў у швейцарскай Лазане прэзідэнт гэтай арганізацыі Янез Качыянчыч. У сустрэчы прынялі ўдзел першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Андрэй Асташэвіч і Георгій Катулін. Апошні выступіў перад удзельнікамі пасяджэння з прэзентацыяй, ён інфармаваў аб ключавых момантах пры падрыхтоўцы Еўрапейскіх гульняў, змяненнях, якія адбыліся ў параўнанні з апошняй сустрэчай у лістападзе мінулага года. Георгій Катулін расказаў выканкаму аб пагадненнях па супрацоўніцтве з дырэкцыяй такіх буйных кампаній, як «Спорт-пары» (першы аператар электронных інтэрактыўных гульняў у Беларусі) і velcom. Тэлекамунікацыйны аператар набыў статус афіцыйнага аператара сувязі II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. На вырашальнай стадыі — перамовы па выбары дамашняга тэлевяшчальніка. На гэтую ключавую пазіцыю прэтэндуюць тры міжнародныя кампаніі: іспанская ISB, партугальская Medialuso-Mediapro і расійскі «Матч ТБ».

У найбліжэйшы час чакаецца вырашэнне пытання аб выбары IT-аператара, ужо вызначаны білетны аператар. Кантракт знаходзіцца на стадыі ўзгаднення. Нагадаем, квіткі на турнір для замежных гасцей заменяць візы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **22 февраля 2018 г.** в 14.00 г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел. (8 01797) 55-7-35, тел/факс (8 01797) 55-7-36<br>С момента опубликования извещения до 16.00 20 февраля 2018 г.<br>В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
